

«ШЧАСЛІВАЯ» ЛЮБАЧКА: ГІСТОРЫІ ЧЫТАЧОЎ 6

ВОДГУК МАГІЛЯЎЧАН НА НОВЫ ПАДАТКОВЫ КОДЭКС МС




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ВЕРАСНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 179 (29046)


9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр РУМАК, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«Беларусь, як і нашы найбліжэйшыя суседзі і краіны ЕС, характарызуецца доўгатэрміновым і прагрэсуючым працэсам старэння насельніцтва. На пачатак 2019 года ў краіне пражывала больш за два мільёны пажылых людзей — старэйшых за 60 гадоў, што складае каля 22 % усяго насельніцтва. Для параўнання, у 2012 годзе пажылых людзей у нас было 19,4 %. Згодна з дэмаграфічным прагнозам, да 2030 года доля такіх грамадзян складзе больш за 27 %. Гэта ставіць на парадак дня пытанне ўдасканалення сістэмы сацыяльнага абслугоўвання».*

# Мужчынская забава



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

• Больш за 900 тысяч чалавек, старэйшых за 70 гадоў, пражывае ў Беларусі.

• **Гарбуз вагой 450 кг, вырашчаны гродзенцам Сяргеем Гаўраніным *(на фота злева)*, прадэманструюць у АК «Каробчыцы».**



• Гурт Metallica — самы паспяховы па гастролях у свеце. З 1982 года калектыў музыкантаў пабываў на ўсіх кантынентах, у 48 краінах, зарабіўшы $1,4 млрд.

Чвэрць стагоддзя 25

# ПАСТУПАЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ ДЛЯ ЎМАЦАВАННЯ ЛІДАРСТВА

**Сёлета Гродзенская вобласць адзначае свой 75-гадовы юбілей, святочныя мерапрыемствы распачынуцца ўжо сёння. Напярэдадні гэтай значнай даты «Звязда» сустрэлася са старшынёй Гродзенскага аблвыканкама Уладзімірам КРАЎЦОВЫМ, каб пагутарыць пра асноўныя кірунні развіцця рэгіёна, яго дасягненні і задачы на перспектыву. А яшчэ закранулі тэмы будаўніцтва АЭС у Астраўцы і рэстаўрацыі Старога замка ў Гродне.**

СТАР. 4–5

## З юбілеем жыхароў Гродзенскай вобласці павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка

«Найноўшая гісторыя рэгіёна вядзе адлік з 20 верасня 1944 года, калі ў найскладанейшы час пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў была створана вобласць з цэнтрам у старажытным горадзе Гродна. Ваша плённая праца і шчырая любоў да малой радзімы паднялі яе з пасляваенных руін, зрабілі выдатным і квітнеючым краем, якім сёння ганарыцца ўся краіна», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Гродзенская вобласць славіцца сваімі традыцыямі, заснаванымі на працавітасці, гасціннасці і ветлівасці. «Спакон веку гэта зямля энергічных і моцных духам людзей, ініцыятыўных, дзейных і таленавітых», — адзначыў ён.

«Нязменна высокія дасягненні ў сельскай гаспадарцы вывелі вобласць у лік лідараў па вытворчасці прадуктаў харчавання і з'яўляюцца прыкладам для аграрыяў нашай краіны. Неацэнны ваш унёсак у захаванне нацыянальнай духоўнай і гісторыка-культурнай спадчыны, развіццё прамысловага і турыстычнага патэнцыялу краіны», — канстатаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананне, што энергія, настойлівасць і мэтанакіраванасць і надалей будуць для жыхароў рэгіёна вернымі спадарожнікамі ў рэалізацыі маштабных планаў і задач на карысць роднай Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы пажадаў жыхарам Гродзенскай вобласці поспехаў ва ўсіх пачынаннях, моцнага здароўя, шчасця, міру і дабрабыту.

ISSN 1990 - 763X


Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!
Ідзе падпіска на IV квартал 2019 года
ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ГЛЯДЗЕЦЬ УГЛЫБ — І Ў ЭКАНОМІЦЫ, І Ў «САЦЫЯЛЦЫ»

**Сціплы і крайне няўстойлівы — такую характарыстыку эканамічнаму росту даў Прэзідэнт падчас даклада па эканоміцы. На сустрэчы разгледзелі пакет прагнозных дакументаў на 2020 год. У іх ліку — ключавыя параметры сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, праект бюджэту, Дзяржаўная праграма кіравання дзяржаўнымі фінансамі, Асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі. Не застаўся без увагі Прэзідэнта — як лідара краіны і як педагога — выпадак у гомельскай школе № 15, калі пасля канфлікту з вучнем педагог была адразу звольнена.**

## Прагноз надвор'я ў эканоміцы

«Настаў момант сур'ёзна звярнуцца да таго, як мы працуем сёлета, калі мы вельмі дрэнна выконваем уласныя планы, якія мы самі для сябе прапісваем, стаіць пытанне, навошта нам увогуле тады збірацца ў такім фармаце напярэдадні канца года і разглядаць нейкія планы і прагнозы, калі мы іх не выконваем?» — заўважыў Прэзідэнт.

На дакладзе ў Палацы Незалежнасці прысутнічалі не толькі распрацоўшчыкі дакументаў, але і тыя, хто даваў па іх заключэнні альбо мае альтэрнатыўны пункт гледжання. Прагноз на гэты год прымаўся дзеючым складам урада.

Лідар дзяржавы адзначыў, што на леташняй нарадзе ён чуў доказы, што прагноз вывераны, абгрунтаваны і праліčаны, і яго даручэнне вядомае — усё запланаванае павінна быць рэалізавана.

«У многіх з вас і асобных іншых чыноўнікаў у галаве думка, вось выбары ды іншае, хто будзе і як будзе працаваць. Публічна адказваю вам на гэта пытанне: той, хто сёння працуе і выконвае прагнозы, планы, прыносіць краіне карысць, той будзе працаваць, натуральна, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — У мяне няма палітыкі асабліва набліжаных, аддаленых. І як там сёння актыўна пісаваюць у інтэрнэце — «Лукашэнка, транзіт улады, хто будзе ва ўладзе» і гэтак далей... Дзяцей пачынаюць перабіраць. Дык вось, паслухайце мяне, ніякіх дзяцей не перабірайце. Ніякія дзеці ў мяне не рыхтуюцца ні да якога транзіту ўлады».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, працаваць з ім (як і раней) будуць толькі тыя, хто хоча гэта рабіць, умее слухаць, выконваць даручэнні, каб не было так, як у выпадку з настаўніцай у Гомелі.

## Навесці парадак у школе

«Калі Румас, і Качанава, і іншыя віцэ-прэм'еры, міністры мяне не чуюць, вы лепш збірайце партфелі і сыходзьце адразу. І справа не ў гэтай настаўніцы, а справа ў тым, што вы не пачулі мяне на лінейцы (калі я адкрываў новую школу ва Уручы), — у нас бардак у школе. Там парадак трэба наводзіць. Вы што, чакаеце яшчэ, каб як у Стоўбцах у нас адбылося?», — нагадаў лідар дзяржавы жахлівы выпадак забойства двух чалавек старшакласнікам.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, усё пачынаецца са здзекаў з настаўнікаў. Асабліва абурыўся ён тым, што гэта здымаюць на камеру тэлефона вучні чацвёртага класа, а ім па 9—10 гадоў.

Прэзідэнт звярнуўся да старшыні Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта Генадзя Салаўя: «У цябе куля праляцела побач з вухам, таму што ты там зусім нядаўна, а тое табе б было, што і ўсім астатнім».

Аляксандр Лукашэнка асудзіў кіраўнікоў, якія, спалохаўшыся выкладзенага ў інтэрнэт відэа, злыдзілі разборкі і пакаралі педагога. «Я на месцы гэтага настаўніка галаву б адкруціў шчанюку якомусьці. У тэлефонах сядзяць там... Няўжо вы не разумееце, у вас жа свае дзеці, што айфон, тэлефон ці іншыя гаджэты ў школе — гэта не толькі адцягванне ад заняткаў. Яны перастаюць думаць», — абурыўся Прэзідэнт.

Ён адзначыў: нядаўна на сустрэчы міністр адукацыі Ігар Карпенка запэўніў, што ў сістэме ўсё выдатна. А на самай справе...

«Калі такі бардак у школе, не патрэбны ні падручнікі, ні праграмы, ні новыя метадычкі — усё гэта пустая трата грошай, — выказаў думку беларускі лідар. — Развакалі ды меркавалі, стрэлачніка знайшлі. Углыб глядзіце».

## Узровень жыцця — асноўны паказчык

Такая ж сітуацыя, па словах Прэзідэнта, і ў эканоміцы: «Яшчэ раз паўтараю: не будуць выкананы параметры развіцця на 2019 год — усе адказныя, ад прэм'ер-міністра, сыдзеце».

Дарэчы, гэтую ўстаноўку Аляксандр Лукашэнка даваў год таму, калі зацвярджалі планы на 2019-ы. Лідар дзяржавы падкрэсліў, што такія меры не маюць нічога агульнага з выбарчай кампаніяй.

Ды і ў эканоміцы справа не столькі ў паказчыках — станоўчыя вынікі яе работы павінны адчуваць на сабе людзі праз павышэнне свайго дабрабыту і ўзроўню якасці жыцця. Без эканамічнага росту гэтага дамагчыся немагчыма.

«Аднак мяне насцярожвае, што гэты эканамічны рост не толькі сціплы, але і вельмі няўстойлівы, калі казаць мякка. Гэтую тэндэнцыю неабходна мяняць. Хто хоча і можа — заставайцеся і змяняйце. З аднаго боку, урад перасцерагае, што хуткія тэмпы ствараюць пагрозу для макраэканамічнай раўнавагі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Навошта вы мне гэты радок напісалі? Хто зразумее, што я сказаў? Што, калі мы створым больш і прададзім, — гэта горш для краіны, што мы так ужо разагрэлі эканоміку, што заўтра ўся краіна палыхне ад гэтага разагрэву».

Прэзідэнта цікавіла, перш за ўсё, што зроблена і што трэба зрабіць для таго, каб эканоміка была трывалая, а фактары, якія могуць прыводзіць да эканамічных дыспрапорцый, канчаткова ліквідаваны.

«Мы не можам заняць пазіцыю пабочных назіральнікаў і задавольвацца збалансаванасцю, выдуманай, напісанай на паперцы. Людзі, аказваючы давер у ходзе рознага кшталту палітычных (у тым ліку) кампаній, не за гэта галасавалі, не гэтага ад нас патрабуюць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік краіны папрасіў дакладчыкаў сканцэнтравацца на тым, як будуць выконвацца ўсе абяцанні, дадзеныя Прэзідэнту, а ім у сваю чаргу — народу.

Першым з дакладам выступіў прэм'ер-міністр Сяргей Румас. Па яго словах, з сямі зацверджаных на 2019-ы год прагнозных паказчыкаў выконваюцца чатыры. Не выходзіць эканоміка на прагнозны ўзровень па тэмпах росту экспарту, прадукцыйнасці працы, не выконваюцца заданні па валавым унутраным прадукце.

За экспарт тавараў і паслуг ва ўрадзе адказнасць была ўскладзена на віцэ-прэм'ераў. Але выкананне гэтага паказчыка — задача кожнага і асабліва Міністэрства замежных спраў, якое мае шырокую сетку дыппрадстаўніцтваў у свеце.

«Віцэ-прэм'еры не павінны бегаць за міністрамі, а міністры не павінны бегаць за губернатарамі, калі гэта, напрыклад, сельская гаспадарка. Толькі займацца тэхналогіямі. Міністр сельскай гаспадаркі — гэта тэхналогіі, новае нешта, перспектыўнае. Сеяць, убіраць, касіць, вазіць, кансерваваць — гэта справа губернатараў, старшынь райвыканкамаў, кіраўнікоў гаспадарак. Гэта іх справа. А віцэ-прэм'ер павінен заняцца ключавым пытаннем, калі гэта сельская гаспадарка, — экспартам прадукцыі», — расказаў аб пастаўленай задачы Прэзідэнт.

У фокусе ўвагі на нарадзе таксама былі інвестыцыі. Асноўнае патрабаванне да іх — эфектыўнасць і выніковасць. Такога ж чакаюць і ад работы прадпрыемстваў. Тут поспех залежыць ад кваліфікаваных кадраў у кіраўніцтве. Не абышлі і тэму заробкаў бюджэтнікаў: патрабаванне адзінае — дасягнуць 80 % ад сярэдніх па краіне. Асабліва гэта датычыцца найбольш неабароненых колаў сярод супрацоўнікаў дзяржаўнага сектара.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### ❍ У тэму

Пасля нарады яе падрабязнасці расказаў **прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС.**

Сёння ўрад уносіў Прэзідэнту пакет прагнозных дакументаў на 2020 год. Традыцыйна даклад пачаўся з вынікаў 2019 і планаў на будучы год, улічваючы, што ён заключны ў пяцігодцы.

«Што датычыцца выканання зацверджаных планаў на 2019 год, сёння ўрад выконвае чатыры з сямі даведзеных паказчыкаў. Няма выканання па экспарце, прадукцыйнасці працы, і істотна недавыконваем мы вынікова паказчык валавога ўнутранага прадукту. Кіраўнік дзяржавы падрабязна пытаў пра прычыны невыканання і асабліва доўга спыняўся на прычынах, чаму не выконваецца экспарт сёлета і якія планы па экспарце на 2020 год», — паведаміў Сяргей Румас.

Урад далажыў, што праблемы з экспартам у гэтым годзе звязаны ў асноўным з таварамі нафтавай групы — брудная нафта і падатковы манеўр. «Але разам з тым рэзультуючы паказчык, сальда тавараў і паслуг (за сем месяцаў. — **«Зв».**) у нас станоўчы — больш за 400 мільёнаў рублёў, то-бок тая астача, што застаецца паміж экспартам і імпартам», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Па яго словах, Прэзідэнт неаднойчы засяродзіў увагу, што планы, якія былі зацверджаны летась з падачы ўрада, безумоўна павінны быць выкананы.

«У астатнія чатыры месяцы ўрад прыкладзе ўсе намаганні, каб дагнаць тое, што намі недавыканана ў 2019 годзе. Што датычыцца 2020 года: кіраўнік дзяржавы палічыў планы ўрада недастаткова напружанымі, і пакет дакументаў адпраўлены на дапрацоўку», — сказаў кіраўнік урада.

У сціслыя тэрміны Саўмін павінен дапрацаваць дакументы, каб праект бюджэту і Асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі разгледзець бягучым складам парламента.

Падключыцца да ўдасканалення дакумента павінна маніторынгавая група на чале з Міхаілам Мясніковічам, дэпутацкі корпус ніжняй палаты парламента, Адміністрацыя Прэзідэнта, Камітэт дзяржаўнага кантролю, Нацыянальны банк і кіраўнікі аблвыканкамаў.

# НЕ ЗГУЛЯЕМ, АЛЕ СУПЕРКУБАК ПРЫВЯЗЁМ?

**Беларусь гатова прыняць футбольныя спаборніцтвы самага высокага ўзроўню, у тым ліку Суперкубак УЕФА**

**Аляксандр Лукашэнка падчас перамоў з прэзідэнтам Саюза еўрапейскіх асацыяцый (УЕФА) Аляксандрам Чэферынам адзначыў, што Беларусь можа прыняць спаборніцтвы любога ўзроўню і правесці іх не горш, чым найлепшыя сталіцы нашага кантынента.**

Кіраўнік краіны напачатку падзякаваў госцю за дапамогу федэрацыі самага масавага і папулярнага віду спорту ў Беларусі і выказаў спадзяванне, што з выбраннем Аляксандра Чэферына прэзідэнтам УЕФА кантакты з саюзам павялічацца, і будзе поўнае паразуменне. «Я не магу паскардзіцца і наракаць, што ў мінулыя часы ў нас былі нейкія праблемы з федэрацыяй футбола, — падкрэсліў Прэзідэнт. — УЕФА заўсёды адгукаўся на нашы просьбы, заўсёды дапамагаў нам, асабліва дзіцячаму спорту. І вы ведаеце: ніколі мы не чулі з боку саюза якога-небудзь папроку ў наш адрас, што мы нямэтавым чынам выкарысталі грошы, што мы не дапамагалі дзецям, што мы не дапамагалі футболу».

Аляксандр Лукашэнка запэўніў: дзяржава і далей будзе садзейнічаць развіццю футбола. Але Прэзідэнт адзначыў і недапрацоўку ва ўзаемадзеянні — УЕФА ніколі раней не песціў Беларусь буйнымі спартыўнымі мерапрыемствамі.

«Калі Саюз еўрапейскіх асацыяцый у гэтым кірунку будзе думаць, ведайце, што мы гатовы прыняць любыя спаборніцтвы, на любым узроўні, што датычыцца нашага кантынента. Я ведаю, што апошнім часам шмат абмяркоўваецца ў розных колах пытанне аб правядзенні суперматча, фінальнага матча на кубак УЕФА. Ведайце, калі ў вас будзе магчымасць вызначыць месцам правядзення такога матча нашу сталіцу, нашу Беларусь, мы заўсёды будзем з гэтым салідарныя і згодныя. І зробім гэта не горш, чым найлепшыя сталіцы нашага кантынента», — сказаў кіраўнік краіны.

### ❍ Даведка

**Асацыяцыя «Беларуская федэрацыя футбола» падала дэкларацыю аб зацікаўленасці ў правядзенні Суперкубка УЕФА 2022 ці 2023 гадоў 20 чэрвеня гэтага года. Афіцыйную заяўку неабходна прадставіць да 28 кастрычніка 2019-га. Канчатковае рашэнне аб месцы правядзення спаборніцтва прыме Выканаўчы камітэт Саюза еўрапейскіх асацыяцый (УЕФА) вясной 2020 года. Суперкубак УЕФА разыгрываецца ў адным матчы, падчас якога сустракаюцца пераможцы Лігі чэмпіёнаў УЕФА і Лігі Еўропы УЕФА мінулага сезона.**

Аляксандр Чэферын адзначыў: УЕФА і Беларуская федэрацыя футбола вельмі добра супрацоўнічаюць, але нават і самае плённае ўзаемадзеянне магчыма яшчэ палепшыць.

«Я рады бачыць, што ў Беларусі спорт атрымлівае такую падтрымку, і я, канешне, асабліва рады за футбол. Заўтра мы пачнём новы этап нашага супрацоўніцтва. І мы плануем падтрымліваць Беларусь і аказваць падтрымку, як мага хутчэй. Мы і раней дапамагалі і з фінансавымі сродкамі, і з інфраструктурай. Мы плануем аказваць падтрымку ў плане адукацыі трэнераў», — канстатаваў прэзідэнт УЕФА.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Класныя навіны

# У СЕЛЬСКІХ НАСТАЎНІКАЎ — ПЛЮС 20 % ДА АКЛАДУ

**Сельскім настаўнікам павысяць тарыфныя стаўкі. Адпаведнае рашэнне замацавана ў пастанове Савета Міністраў ад 18 верасня № 630.**

Беларускі ўрад працягвае працаваць над павышэннем аплаты працы некаторых катэгорый бюджэтнікаў. Чарговае павышэнне заробкаў закране сельскіх педагогаў.

Згодна з рашэннем Саўміна ад 18 верасня № 630, тарыфныя стаўкі (аклады) будуць павялічаны на 20 % тым педагогам, якія працуюць на ўстановах адукацыі па-за сельскай мясцовасцю, але пры гэтым іх рабочае месца размешчана ў сельскай мясцовасці. Таксама павышаюцца аклады і ў супрацоўнікаў установ, якія знаходзяцца ў сельскай мясцовасці. На 20 % павысяцца аклады і ў прыёмных бацькоў, а таксама бацькоў-выхавальнікаў, у якіх рабочае месца размешчана ў сельскай мясцовасці.

Павышэнне тарыфных ставак распаўсюджваецца на адносіны, якія ўзніклі з 1 верасня гэтага года. Дакумент будзе дзейнічаць да канца бягучага каляндарнага года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 18.10.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Зеленкова А. С.**

Легковой седан «Сеат Толедо», 1995 г. в., начальной стоимостью 480 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНН 190431606

**УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 21.10.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Самохвастовского А. И.**

Легковой джип «Лэнд-Ровер Рэндж-Ровер Спорт», 2007 г. в., начальной стоимостью 10 160 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНН 190431606

Утерянный аттестат временного (антикризисного) управляющего категории А № 00883 на имя Волохина Сергея Александровича, выданный Департаментом по санации и банкротству Министерства экономики РБ 22.09.2016 г. считать недействительным.

# Выслухаць. Пачуць. Дапамагчы

**У гэтую суботу, 21 верасня, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах пройдуць прамыя тэлефонныя лініі прадстаўнікоў улады з насельніцтвам.**

Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 у суботу правядуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч Барысюк (80162213121);

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч Белавус (80212222222);

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч Гарбачоў (80232331237);

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч Жук (80152735644);

старшыня МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Леанід Канстанцінавіч Заяц (80222501869);

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч Гурыновіч (80175004160);

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Арцём Мікалаевіч Цуран (80172224444).

Надвор'е

# НЕ СПЯШАЙСЯ, ВОСЕНЬ...

## Сіноптыкі абяцаюць, што паветра прагрэецца яшчэ да плюс 20

**У пачатку гэтага тыдня на тэрыторыю нашай краіны завіталі атмасферныя франты і сапраўды халодныя паветраныя масы, якія паступілі з паўночнага захаду Еўропы. Увесь гэты час было няўстойлівае надвор'е з тэмпературным фонам на 1—4 градусы ніжэй за кліматычную норму. Сярэдзіна верасня і такі халодны сюрпрыз.**

А вось і не адгадалі тыя, хто загадзя пачаў хаваць лёгкія летнія рэчы. Яны яшчэ спатрэбяцца, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Вось і ў суботу будзе не самы камфортны дзень, справа ў тым, што ўначы надвор'е ў асноўным будзе фарміраваць вобласць павышанага атмасфернага ціску, раніцай і ўдзень адаб'ецца ўплыў франтальнага раздзелу, які ссоўваецца з Балтыйскага мора. Уначы па паўночным захадзе, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—6 цяпла, у многіх раёнах на глебе і месцамі ў паветры чакаюцца замаразкі ад нуля да мінус 3 градусаў. Удзень будзе ад плюс 7 градусаў па паўночным усходзе да 17 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Паляпшацца ўмовы надвор'я пачнуць у нядзелю. Тэмпература паветра ўначы — 3—10 цяпла, удзень — ад плюс 10 да плюс 17 градусаў, па захадзе краіны паветра прагрэецца да 20 цяпла.

Па папярэдніх прагнозах айчынных сіноптыкаў, у панядзелак надвор'е ў асноўным будзе фарміраваць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Тэмпература паветра ўдзень у асноўным складзе 8—15 градусаў цяпла, па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца ад плюс 16 градусаў да плюс 20 градусаў. Так значна лепш.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Трамп прызначыў новага дарадцу па нацбяспецы

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп прызначыць новым дарадцам па нацыянальнай бяспецы Роберта О'Браена. Аб гэтым паведамляецца на асабістай старонцы прэзідэнта ў Twitter.

«Я рады паведаміць, што прызначу Роберта О'Браена, які цяпер вельмі паспяхова працуе на пасадзе спецпасланніка прэзідэнта па справах заложнікаў у дзяржаўным дэпартаменце, нашым новым дарадцам па нацыянальнай бяспецы. Я доўга працаваў з Робертам. Ён выдатна справіцца з работай!» — напісаў амерыканскі прэзідэнт. Раней кіраўнік ЗША называў і іншыя імёны прэтэндэнтаў на пасаду дарадцы па нацыянальнай бяспецы. У прыватнасці, у ліку кандыдатаў разглядаліся таксама адстаўны генерал-маёр Узброеных сіл ЗША Рыкі Уоддэл і кіраўнік Нацыянальнага ўпраўлення ядзернай бяспекі пры міністэрстве энергетыкі ЗША Ліза Гордан-Хэгерці.

Дональд Трамп 10 верасня адправіў у адстаўку мінулага дарадцу па нацбяспецы Джона Болтана. Ён займаў гэтую пасаду з красавіка 2018 года.

## Зяленскі паабяцаў, што яго рэформа не дазволіць замежнікам купляць зямлю



Толькі грамадзяне Украіны змогуць купляць зямлю ў краіне ў выпадку рэалізацыі рэформы, прапанаванай камандай прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага. Пра гэта заявіў у чацвер сам кіраўнік дзяржавы.

«Зямля належыць украінцам. У мадэлі, якую мы прапануем з урадам, купляць або прадаваць зямлю змогуць толькі ўкраінскія грамадзяне або ўкраінскія кампаніі», — сказаў ён. Зяленскі раскрытыкаваў пункт гледжання, згодна з якім пры адмене мараторыя на продаж зямлі яе будуць масава набываць замежнікі, назваўшы такога кшталту засцярогі «страшылкамі» і «трызненнем».

Зяленскі заяўляў раней, што сёлета будзе праведзена зямельная рэформа, якая дазволіць у 2020 годзе стварыць рынак зямлі на 40 млн га. Ён таксама паставіў перад урадам задачу распрацаваць праект гэтай рэформы да 1 кастрычніка.

Узаконіць абарот зямлі ў рынкавых умовах ад Украіны патрабуюць Сусветны банк і Міжнародны валютны фонд.

## У Пентагоне лічаць, што НАТА страціла перавагу над Расіяй

Старшыня аб'яднанага камітэта начальнікаў штабоў Узброеных сіл ЗША генерал Джозэф Данфард заявіў, што НАТА страціла ваенную перавагу над Расіяй за апошнія гады, перадае Newsweek.

Паводле яго слоў, Расія — гэта канкурэнт, над якім перавага НАТА страчана. Таксама Данфард адзначыў, што кіраўнікі міністэрстваў абароны краін Паўночнаатлантычнага альянсу лічаць, што баланс сіл змяніўся. Ён дадаў, што Расія і Кітай старанна вывучылі ваенную стратэгію і дзеянні амерыканскага боку з моманту заканчэння «халоднай вайны». На думку генерала, Расія ўлічыла ўсе слабыя бакі ЗША і паспрабавала разабрацца ў іх тэхналогіях і стратэгіях.

Раней паведамлялася, што Данфорд назваў Расію адным з галоўных сапернікаў ЗША ў космасе.

Спажывец

# ХТО — ПРАДАЦЬ, ХТО — КУПЛЯЦЬ

**На наступным тыдні ў Мінску, а адначасова і ў іншых буйных гарадах краіны пачнецца сезон восеньскіх сельскагаспадарчых кірмашоў. У сталіцы яны будуць праходзіць з 28 верасня да 27 кастрычніка, паведаміў намеснік начальніка аддзела арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Дзмітрый ПЛЯХАНАЎ.**

Самыя грандыёзныя кірмашы выхаднога дня пройдуць 28—29 верасня, а таксама 5—6, 12—13 і 25—27 кастрычніка на паркоўцы пабліза «Чыжоўка-Арэны». Два цэнтральныя кірмашы запланаваны 19 і 20 кастрычніка на пляцоўцы ў раёне Палаца спорту, дзе таксама можна будзе купіць агародніну, садавіну і іншую прадукцыю. Кірмашы гэтага фармата будуць праходзіць з 9 да 16 гадзін.

У той жа час з канца верасня і ўвесь кастрычнік кірмашы пройдуць і ў кожным з раёнаў Мінска. Так, напрыклад, на пляцоўках Маскоўскага, Кастрычніцкага і Першамайскага раёнаў яны разгорнуцца па пятніцах. Інфармацыя па кожнай з пляцовак размешчана на афіцыйным сайце Мінгарвыканкама, а таксама на сайце Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку гарвыканкама.

Мясцовыя чыноўнікі лічаць, што правядзенне кірмашоў дазволіць забяспечыць гараджан плодаагароднінай прадукцыяй наўпрост ад сельгасвытворцаў па мінімальных цэнах. І што гэта, вядома ж, акажа ўплыў на фарміраванне цэн на рынках і ў крамах горада. «У цяперашні час цэнавая сітуацыя ў горадзе стабільная», — падзяліўся Дзмітрый Пляханаў.

Ён, дарэчы, адзначыў, што на мінулым тыдні ў пунктах гандлю спажывецкага рынку Мінгарвыканкама знізіліся цэны на некаторую агародніну. Было заўважана, што на 2 % знізіліся цэны на бульбу, на моркву — да 14 %, на сталовыя буракі і рэпчатую цыбулю — да 24 %.

Рознічныя цэны па стане на 18 верасня на бульбу склаліся ў дыяпазоне ад 69 капеек да 1,5 рубля на Камароўскім рынку, ад 35 капеек да рубля на «Ждановічах», ад 50 да 80 капеек на рынку «Малінаўка» і ад 60 да 80 капеек на Чыжоўскім рынку. Прадпрыемствы гандлю Мінска рэалізуюць бульбу па 47 капеек і гранічна па 1,24 рубля за кілаграм. Па словах прадстаўніка гандлю, буракі прадаюцца па цане 0,39—1,29 рубля, морква — 0,44—1,63 рубля, капуста — 0,42—1,18 рубля, цыбуля — 0,5—1,68 рубля, часнок — ад 2,5 рубля. Цэннік на самыя танныя таматы на рынку цяпер у межах 25 капеек, на агуркі — 80 капеек. І гэта не дзіўна, бо ў перыяд восеньскіх кірмашоў цэны істотна зніжаюцца. А айчынныя яблыкі прапануюць ад аднаго рубля, а грушу ад двух рублёў за кілаграм.

Рэалізоўваць сваю прадукцыю на рынках могуць не толькі буйныя фермерскія гаспадаркі, але і дробныя прыватнікі. Гандаль можна будзе весці пры наяўнасці дакументаў, якія пацвярджаюць якасць і бяспеку прадукцыі. Асобным фізічным асобам трэба будзе прадставіць даведку мясцовых органаў, якія пацвярджаюць, што прадукцыя вырашчана на ўчастку для вядзення асабістай дапаможнай гаспадаркі.

Дарэчы, ужо традыцыйна ўдзельнікам ВАВ прадукцыю дастаўляць па месцы жыхарства абсалютна бясплатна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Хакей

# УВАЙСЦІ Ў ГІСТОРЫЮ

## Федэрацыі хакея Беларусі і Латвіі абвяшчаюць старт конкурсу на распрацоўку талісмана чэмпіянату свету 2021 года, які прымуць гэтыя краіны

**З 18 верасня да 18 кастрычніка 2019 года ўсім ахвотным неабходна дасылаць свае работы на адрас mascot@2021iihfwm.com, а ўжо з 19 кастрычніка да 8 снежня 2019 года спецыяльнае журы вызначыць пераможцу і лаўрэатаў конкурсу.**




У журы, акрамя прадстаўнікоў нацыянальных хакейных федэрацый Беларусі і Латвіі, увайшоў зоркі спорту і шоу-бізнесу з сусветнымі імёнамі. Пра тое, каму ж трэба будзе выбіраць галоўны сімвал чэмпіянату свету ў кампаніі з **Генадзем САВІЛАВЫМ, кіраўніком Аргкамітэта чэмпіянату свету — 2021** з беларускага боку, і **Эдгарсам БУНЦІСАМ**, які адказвае за падрыхтоўку форуму ў Латвіі, арганізатары конкурсу паведамяць дадаткова.

— Выбар талісмана — адзін з ключавых этапаў падрыхтоўкі маючага адбыцца чэмпіянату свету. Гэта вобраз, з якім сотні тысяч хакейных балельшчыкаў будуць асацыяваць і сам спартыўны форум, і нашу краіну, — адзначыў Генадзь Савілаў. — У 2006-м у Рызе такім сімвалам стаў бабёр Рыкс, у 2014-м Беларусь паўстала ў вобразе зубра Волата. Але сёння ў нашых краін ужо новы твар, таму мы шчыра спадзяёмся, што талісманам чэмпіянату свету 2021 года будзе зборны вобраз, які спалучае ў сабе традыцыі нашых краін, але разам з тым, будзе сучасны, дынамічны, яркі, як і ўвесь сусветны хакей.

Эдгарс Бунціс таксама пракаментаваў старт конкурсу:

— Падрыхтоўка да правядзення чэмпіянату свету па хакеі, які Беларусь і Латвія прымуць у 2021 годзе, вядзецца ўжо даўно, аднак конкурс на стварэнне талісмана з'яўляецца, бадай, адным з першых бачных крокаў для грамадскасці. Маскот — вельмі важны кампанент любога турніру, таму мы рады даць магчымасць балельшчыкам самім прыняць удзел у яго стварэнні. Няхай пераможа наймацнейшы!

Пераможца конкурсу атрымае камплект білетаў на дзве персоны на любыя пяць гульняў чэмпіянату па выбары пераможцы, а таксама атрымае экскурсію на дзве персоны па падтрыбунных памяшканнях афіцыйнай арэны чэмпіянату перад адной з гульняў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**



## Извещение об открытом аукционе по продаже конфискованного имущества 22 октября 2019 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Условия продажи | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Изолированное помещение с инвентарным номером 400/D-155423 (назначение — квартира, наименование — квартира № 40) | г. Гродно, ул. Тавлая, д. 44б, кв. 40 | 75 600,00 | 7 560,00 | Без условий | Квартира общей площадью 58,5 кв. м. Год постройки – 2014. Стены – газосиликатные блоки, кирпич, этаж 4/7. Здание расположено на земельном участке с кадастровым номером 440100000002009258 общей площадью 0,2308 га |

* — Лот продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, тел. (0152) 720537, 720010.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

— Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель — коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

— **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Аукцион состоится 22 октября 2019 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 23 сентября по 16 октября 2019 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720537, 720010. Адрес сайта: www.grodno.gov.by

# ПАСТУПАЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ



Фота Леаніда ШЧАГЛОВА, БелТА.

## Стратэгічны прынцып — шматвектарнасць

***— Уладзімір Васілевіч, сацыяльна-эканамічнае развіццё — гэта той фундамент, на якім грунтуецца дабрабыт канкрэтнай тэрыторыі. Узровень жыцця вобласці сёння фарміруецца дзякуючы ўдзелу ўсіх звёнаў: ад работы буйных прадпрыемстваў рэгіёна да мікраарганізацый і асобных работнікаў. Якія змены ў сацыяльна-эканамічным становішчы вобласці цягам апошніх 25 гадоў вы б адзначылі найперш? Як бы вы ахарактарызавалі асноўныя тэндэнцыі развіцця рэгіёна сёння?***

— У выніку планамернай работы на працягу апошніх 25 гадоў адбывалася паступальнае развіццё ўсіх галін эканомікі вобласці. За кошт правядзення буйнамаштабнай мадэрнізацыі, стварэння і развіцця навукаёмістых, рэсурса- і энергазберагальных вытворчасцяў, павышэння ўзроўню канкурэнтаздольнасці прадукцыі, якая выпускаецца прамысловасцю, вобласць дэманструе дынаміку развіцця.

Трэба сказаць, што Гродзеншчына мае значны прамыславытворчы патэнцыял у розных галінах: 192 прадпрыемствы (47 з іх недзяржаўнай формы ўласнасці) вырабляюць каля 10 % прамысловай прадукцыі краіны. Гэта прадукты харчавання, мінеральныя ўгнаенні, хімічныя валокны, лакі і фарбы, будаўнічыя матэрыялы, збожжаўборачныя камбайны, прадукцыя лёгкай, дрэваапрацоўчай прамысловасці.

Дарэчы, у вобласці знаходзіцца ўвесь рэспубліканскі аб'ём вытворчасці аміяку, капралактаму, кордных шынных тканін, дзіцячага харчавання, больш за 90 працэнтаў — азотных угнаенняў. Дзве трацiны ўсіх панчошна-шкарпэтачных вырабаў, палова рэспубліканскага аб'ёму вытворчасці драўняна-стружкавых пліт вырабляецца менавіта ў Гродзенскай вобласці. Гэтыя дасягненні на рахунку добра вядомых (нават за межамі краіны) прадпрыемстваў рэгіёна — «Гродна Азота», тытунёвай фабрыкі «Нёман», «Белкарда», «Лакафарбы», Скідзельскага цукровага камбіната, «Контэ Спа», «Лідскага піва» і многіх іншых. Пералік можна працягваць.

Трэба сказаць, што больш за палову выраблена́й прадукцыі экспартуецца. Многія прадпрыемствы сертыфікавалі сваю прадукцыю на адпаведнасць міжнародным стандартам: па сваіх тэхнічных характарыстыках, надзейнасці ў эксплуатацыі яна цалкам канкурэнтаздольная на сусветных рынках.

Сёння прадукцыя рэгіёна пастаўляецца больш чым у 110 краін свету. Стратэгічны прынцып знешнеэканамічнай дзейнасці — шматвектарнасць, якая спрыяе развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў многіх кірунках. У нас наладжаны сувязі з рэгіёнамі Расіі, краінамі Еўропы, Паўднёва-Усходняй Азіі, Блізкага Усходу, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, Кітаем і ЗША. Летась аб'ём знешняга гандлю таварамі дасягнуў 2,3 мільярда долараў ЗША, што складае 118,9 % да пазалеташняга ўзроўню.

Паспяхова функцыяне свабодная эканамічная зона «Гроднаінвест», рэзідэнты якой маюць ільготныя падаткі і іншыя прэферэнцыі.

Між іншым, Прынёманне ўжо шмат гадоў утрымлівае планку самага развітога аграрнага рэгіёна Беларусі і забяспечвае больш за 16 % валавой сельскагаспадарчай прадукцыі дзяржавы. Не падвялі мы і сёлета. На 1 верасня па выніках жніва ў агульны каравай гродзенцы паклалі 1189,9 тысячы тон збожжа. І, як заўсёды, мелі самую высокую ўраджайнасць, збіраючы з кожнага гектара 36,7 цэнтнера хлеба. Абласны лідар жатвы — Гродзенскі раён. Тут хлебаробы сабралі 175,8 тысячы тон збожжа пры ўраджайнасці 60 цэнтнераў з гектара.

Не меншую значнасць у сельскай гаспадарцы рэгіёна мае і жывёлагадоўля. Яе ўдзельная вага ў агульным аб'ёме сельгасвытворчасці складае каля 60 працэнтаў.

Лічу, што ў свой час у краіне быў правільна абраны кірунак па стварэнні буйных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў: гэтыя намаганні дазволілі сканцэнтраваць пагалоўе жывёлы на адмысловых комплексах, забяспечыць тэхналагічнасць працэсаў і высокую прадукцыйнасць жывёл.

Хочацца адзначыць, што за дасягненне найлепшых вынікаў у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця Гродзенская вобласць неаднаразова заносілася на Рэспубліканскую дошку гонару.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Тэхпераўзбраенне і мадэрнізацыя вытворчасці

***— Рэалізацыя дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на Гродзеншчыне дала другое нараджэнне 239 населеным пунктам, якія атрымалі статус аграгарадкоў з адпаведнымі станоўчымі зменамі ў іх, у першую чаргу інфраструктурнымі. Разам з тым канцэптуальныя змены адбыліся і ў вытворчым аспекце: аграпрамысловы комплекс выйшаў на якасна новы ўзровень дзякуючы мадэрнізацыі і тэхнічнаму пераасначшэнню гаспадарак. Якія дасягненні ў гэтай галіне — асаблівы гонар Прынёмання і вырашэнне якіх задач яшчэ знаходзіцца ў перспектыўнай прасторы?***

— Сапраўды, як для краіны, так і для Гродзеншчыны праграма адраджэння і развіцця вёскі прыдала значны імпульс у развіцці сельскіх тэрыторый. Значная дзяржаўная падтрымка дазволіла ў апошнія гады тэхнічна пераўзброіць аграпрамысловы комплекс, палепшыць умовы працы работнікаў і павысіць эканамічную эфектыўнасць.

Ужо на працягу многіх гадоў у аграпрамысловым комплексе вядзецца планамерная работа па мадэрнізацыі і тэхнічным пераасначшэнні сельскагаспадарчай вытворчасці. Абнаўляецца машынна-трактарны парк больш новымі энерганасычанымі машынамі. Будуюцца і рэканструюцца малочнатаварныя комплексы, сховішчы травяных кармоў, бульбасховішчы, плодаагароднінасховішчы.

Так, у раслінаводстве праведзены работы па аптымізацыі плошчаў бульбы, агародніны, пладоваягадных угоддзяў, аптымізаваны льнаводчыя прадпрыемствы ў бок канцэнтрацыі і ўзбуйнення вытворчасці, што дазволіла атрымліваць высокія ўраджаі.

У апошнія гады жывёлагадоўчая галіна Гродзенскай вобласці значна мадэрнізавалася, асабліва малочная галіна. Так, з 2009 да 2018 года пабудаваны 81 сучасны малочнатаварны комплекс магутнасцю 700 і больш кароў кожны, праведзена рэканструкцыя 136 малочнатаварных фермаў пад беспрывязнае ўтрыманне з устаноўкай даільных залаў і аднатыпным кармленнем. Гэта дазволіла перавесці 74 % малочных кароў (162 тысячы галоў) ад іх агульнай колькасці на фермы з даільнымі заламі і круглагадовае стойлавае ўтрыманне.

У апошнія гады асаблівая ўвага ў сельскагаспадарчай вытворчасці аддавалася патанненню прадукцыі, рэсурсазахаванню і эканоміі на вытворчасці, тэхнічнаму абнаўленню і пераўзбраенню.

Вялікая работа праводзіцца і для фінансавага аздараўлення і падтрымання сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, якія апынуліся ў складаных фінансавых абставінах. Дзеля структурных пераўтварэнняў у нізкаэфектыўных сельскагаспадарчых арганізацыях праводзіцца пэўная работа: вызначаны папярэдні шэраг фінансава ўстойлівых арганізацый, якія маюць магчымасць выступіць у якасці эфектыўнага інвестара, і работа ў гэтым кірунку працягваецца.

Гэтыя крокі накіраваны на павышэнне фінансавай самадастатковасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў вобласці і стварэнне спрыяльных сацыяльна-эканамічных і экалагічных умоў для жыцця насельніцтва ў сельскай мясцовасці, павышэнне прэстыжнасці і ўмацаванне кадраў.

Што датычыцца асноўных задач далейшага развіцця сельскай гаспадаркі на доўгатэрміновую перспектыву, то сярод іх — інавацыйнае развіццё і комплексная мадэрнізацыя эканомікі арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць па вытворчасці, захоўванні і перапрацоўцы прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі, развіцці экаэфектыўнай і арганічнай вытворчасці, фарміраванні развітой лічбавай інфармацыйнай інфраструктуры аграхарчовага рынку ды многія іншыя.

## «Якарны» праект усяго рэгіёна — будаўніцтва АЭС

***— Прыцягненне інвестыцый уплывае на развіццё эканомікі рэгіёна — вядомая аксіёма. Якія з рэалізаваных інвестыцыйных праектаў ці тых, што яшчэ знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі, вы б вылучылі і чаму?***

— Безумоўна, адным з прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Гродзенскай вобласці з'яўляецца інвестыцыйная дзейнасць. Рознагаліновая накіраванасць эканомікі і выгаднае геаграфічнае становішча ствараюць добрыя ўмовы для размяшчэння замежных інвестыцый. Толькі за тры гады бягучай пяцігодкі ў вобласць прыцягнута больш за 230 мільёнаў долараў прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове.

У вобласці рэалізаваны шэраг значных інвестыцыйных праектаў. Сёння найбуйнейшым інвестыцыйным праектам не толькі ў Гродзенскай вобласці, але і ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі ў Астраўцы.

Яно з'яўляецца ў нейкім сэнсе «якарным» праектам для ўсяго рэгіёна. Разам з будаўніцтвам аб'екта развіваецца інфраструктура горада, актыўнымі тэмпамі будуецца жыллё, аб'екты ў сферы паслуг, у тым ліку пры ўдзеле малога і сярэдняга бізнесу.

Прынёманскі край з'яўляецца адной з найбольш прывабных пляцовак для прыцягнення інвестыцый.

Завершана рэалізацыя буйнога інвестпраекта па будаўніцтве цэха азотнай кіслаты магутнасцю 1200 тон у суткі з рэканструкцыяй дзеючай вытворчасці карбамідна-аміячнай сумесі на ААТ «Гродна Азот».

Пры ўдзеле галандскага капіталу рэалізаваны інвестыцыйны праект па пашырэнні вытворчасці садовых клубніц у Шчучынскім раёне, з удзелам аўстрыйскай кампаніі «Кронаспан» ажыццяўляецца рэалізацыя праекта ў Смаргоні па пашырэнні дрэваапрацоўчай вытворчасці і будаўніцтве завода па выпуску фанеры.

У стадыі завяршэння праект па будаўніцтве лагістычнага цэнтра ў раёне пункта пропуску «Бераставіца», а таксама праект па будаўніцтве комплексу па вырошчванні шампіньёнаў у Шчучынскім раёне.

Рэалізацыя такіх праектаў будзе мець не толькі эканамічны, але і станоўчы сацыяльны эфект для рэгіёна.

## Месцазнаходжанне мае вырашальнае значэнне

***— Лагістыка і развіццё транспартнай інфраструктуры таксама маюць значэнне ў наданні рэгіёну большай прывабнасці для ўкладання сродкаў з пункту гледжання патэнцыйных інвестараў. Апошні з рэалізаваных у вобласці праектаў — рэканструкцыя аўтамагістралі М6. Што ў далейшых планах?***

— Выгаднае геаграфічнае становішча вобласці, а таксама агульная граніца з краінамі Еўрапейскага саюза: Літоўскай Рэспублікай і Рэспублікай Польшча, безумоўна, ствараюць прывабныя ўмовы для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў па будаўніцтве лагістычных цэнтраў. Менавіта таму ў Гродзенскай вобласці аддаецца асаблівая ўвага развіццю транспартнай інфраструктуры.

Сёлета кампаніяй ТАА «Влатэ Лагістык» будзе ўведзены ў эксплуатацыю лагістычны цэнтр у раёне пункта пропуску «Берастaвіца». Таксама ажыццяўляецца рэалізацыя інфраструктурных праектаў па стварэнні зон чакання з укараненнем сістэмы «электронная чарга» на пунктах пропуску «Брузгі», «Берастaвіца», «Каменны Лог».

Так, у раёне пункта пропуску «Брузгі» паспяхова функцыянуе лагістычны цэнтр, пабудаваны кампаніяй ТАА «Влатэ Лагістык». Асаблівасцю дзейнасці лагістычнага цэнтра з'яўляюцца яго непасрэднае прымыканне да самога пункта пропуску, выкарыстанне ў рабоце тэхналогіі бестранзітнага перамяшчэння тавараў, наяўнасць сучасных тэхналагічных магчымасцяў для комплекснай апрацоўкі і захоўвання грузаў.

Стварэнне падобных аб'ектаў шмат у чым будзе спрыяць комплекснаму развіццю пунктаў пропуску, транзітнай прывабнасці рэгіёна.

***— Месцазнаходжанне мае вырашальнае значэнне: Гродзеншчына на мяжуе з краінамі Еўрасаюза, таму яе ўдзел у праграмах трансгранічнага супрацоўніцтва і міжнароднай тэхнічнай дапамогі дае свой плён. Рэалізацыю якіх адметных праектаў можна вылучыць з шэрагу іншых?***

— Прыгранічнае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і суседнімі краінамі — Польшчай, Літвой і Латвіяй, рэалізацыя сумесных праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі з'яўляецца вельмі важным кірункам у развіцці двухбаковых узаемаадносін.

# ДЛЯ ЎМАЦАВАННЯ ЛІДАРСТВА

Гродзенская вобласць актыўна ўдзельнічае ў рэалізацыі праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі праграм трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча — Беларусь — Украіна» і «Латвія — Літва — Беларусь». Агульная колькасць прынятых да фінансавання Еўрапейскім саюзам праектаў з удзелам арганізацый Гродзенскай вобласці ў межах дзвюх праграм на 2014—2020 гады складае 57 праектаў на суму каля 27 мільёнаў еўра, у тым ліку тры буйнамаштабныя з агульным аб'ёмам фінансавання 8,65 мільёна еўра. Сярод іх два інфраструктурныя праекты з удзелам партнёраў з Польшчы: адзін рэалізуецца Гродзенскай рэгіянальнай мытняй па будаўніцтве рэнтгенаўскай скануючай сістэмы кантролю транспартных сродкаў у аўтадарожным пункце пропуску «Бераставіца», а другі — праект Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС, у рамках якога будзе створаны і абсталяваны навучальны цэнтр для ратавальнікаў і насельніцтва ў Гродне, набыта спецыяльнае абсталяванне для пажарнай часці. Яшчэ адзін буйнамаштабны праект будзе рэалізаваны лідскай сярэдняй школай № 4 сумесна з партнёрамі з Літвы. Праект прадугледжвае рамонт памяшканняў школы, набыццё мэблі і вучэбнага абсталявання для кабінетаў.



«Якарны» праект усяго рэгіёна — будаўніцтва АЭС

Фота БелТА.

Не застаецца па-за ўвагай і пытанне ўдасканалення і развіцця транспартных паслуг і дарожнай інфраструктуры. Праз удзел камунальнага праектна-рамонтна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Гроднааблдарбуд» у рэалізацыі чатырох сумесных праектаў з партнёрамі з Польшчы ў Гродзенскім раёне ў ваколіцах Аўгустоўскага канала будуць капітальна адрамантаваны дарогі агульнай працягласцю 22 кіламетры. Агульны аб'ём фінансавання — 4,26 мільёна еўра. Таксама хочацца аддаць увагу і праектам у сферы аховы здароўя — агульны аб'ём фінансавання шэсці праектаў па дзвюх праграмах — 2,65 мільёна еўра. На працягу многіх гадоў актыўным удзельнікам рэалізацыі праектаў трансгранічнага супрацоўніцтва ў сферы аховы здароўя з'яўляецца УАЗ «Гродзенская ўніверсітэцкая клініка» (раней УАЗ «Гродзенская абласная клінічная бальніца»), дзякуючы чаму для клінікі набываецца сучаснае дыягнастычнае абсталяванне, медыцынскае абсталяванне для аддзяленняў.

Арганізацыі Гродзенскай вобласці праяўляюць цікавасць да рэалізацыі праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі таксама ў сферах спорту і турызму, культуры, адукацыі, жыллёва-камунальнай гаспадаркі і аховы навакольнага асяроддзя. Сумеснае стварэнне і эфектыўнае развіццё эканамічнай і сацыяльнай інфраструктуры на сумежных тэрыторыях краін-удзельніц, а таксама сумеснае рашэнне эканамічных, транспартных, энергетычных, экалагічных, гуманітарных і іншых пытанняў дазваляюць ствараць умовы, якія спрыяюць паляпшэнню ўзроўню жыцця насельніцтва Гродзенскай вобласці.

## Візітная картка для замежнікаў

***— На Гродзеншчыне сканцэнтравана большасць замкаў Беларусі, практычна ў кожным з іх праводзяцца кансервацыйныя і рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы. Некаторыя з іх узнімаюцца літаральна з руін... Ці ёсць складанасці з аднаўленнем гістарычнай спадчыны?***

— Каб захаваць і адначасова надаць турыстычную прывабнасць аб'ектам гісторыка-культурнай спадчыны, сёлета працягваюцца рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы на Старым замку ў Гродне, Гальшанскім і Лідскім замках.

Акрамя таго, распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя па Навагрудскім і Крэўскім замках. Дабрачынны фонд «Любчанскі замак» з удзелам валанцёраў праводзіць работу па нарыхтоўцы цэглы, якая будзе выкарыстоўвацца для аднаўлення Паўночнай вежы Любчанскага замка. Ужо распрацаваны канцэпцыі музеефікацыі першай чаргі Старога замка, Паўднёва-заходняй вежы Лідскага замка, Паўночнай вежы Гальшанскага замка.

Гэтыя аб'екты знаходзяцца пад пастаяннай пільнай увагай спецыялістаў, таму што ў працэсе адкрываюцца новыя аб'ёмы работ, уносяцца карэкціроўкі.

Дарэчы, усе спрэчныя моманты вырашаюцца ў самыя кароткія тэрміны.

Цяпер вядуцца супрацьаварыйныя работы ў паўночна-ўсходнім корпусе Гальшанскага замка, узмацненне калон з рэстаўрацыяй мура, які прымыкае да Паўночнай вежы, тынкоўка сцен у вежы. Налета ў ёй плануецца адкрыць экспазіцыю.

Завяршаюцца будаўнічыя работы ў Паўднёва-заходняй вежы Лідскага замка. Мясцовы гісторыка-мастацкі музей займаецца распрацоўкай мастацкага рашэння і закупкай прадметаў для пабудовы музейнай экспазіцыі ў вежы.

Стары замак у Гродне — гэта візітная картка Беларусі для тых турыстаў і замежных гасцей, якія пачынаюць сваё падарожжа па краіне з наведвання Прынёманскага рэгіёна. Трэба сказаць, што яго рэканструкцыя прадугледжвае некалькі чэргаў будаўніцтва і паэтапную здачу.

Між іншым, усе работы на гэтым велічным аб'екце забяспечаны належным узроўнем фінансавання. Асноўная задача ў тым, каб знайсці правільныя падыходы да рэалізацыі гэтага праекта. Узнавіць архітэктурныя рашэнні, за якімі хаваецца гісторыя стагоддзяў Старога замка, — задача не з простых, асабліва, калі ў архівах практычна не захавалася апісанняў. Цяпер будаўніцтва працягваецца на ўязной вежы, галерэі, іншых унутраных аб'ектах. Работа зроблена вялікая. Якім замак убачаць гродзенцы і госці абласнога цэнтра пасля рэканструкцыі? Спецыялісты інстытута «Гроднаграмадзянпраект» падрыхтавалі свае прапановы па афармленні ўнутраных інтэр'ераў некаторых памяшканняў. Зараз вырашаецца пытанне, хто возьмецца за рэалізацыю гэтых эскізаў.

## Свята ў хату!

***— Гродзеншчына прыцягальная сваімі брэндавымі мерапрыемствамі, перш за ўсё Рэспубліканскім фестывалем нацыянальных культур. Добра вядомыя за межамі рэгіёна свята памідора ў Іўі, абаранкаў у Смаргоні, Ганненскі кірмаш у Зэльве ды іншыя. Не памылюся, калі скажу, што кожная тэрыторыя мае свой адметны фестываль. Што яшчэ трэба, каб вобласць стала цэнтрам нацыянальнай і рэгіянальнай культуры?***

— У рэчышчы дзяржаўнай культурнай палітыкі актыўная работа па адраджэнні традыцыйнай нацыянальнай культуры, захаванні і папулярызацыі абрадаў, песеннага, танцавальнага і інструментальнага фальклору, рамёстваў вядзецца ўстановамі культуры Гродзеншчыны. Кожным рэгіёнам назапашаны станоўчы і цікавы вопыт, а цэнтры і дамы рамёстваў акцэнты ў сваёй справе робяць на развіццё майстэрстваў, якія існуюць са старажытных часоў. Менавіта ў Навагрудскім раённым цэнтры рамёстваў было адноўлена мастацтва выцінанкі-выбіванкі.

У музеі пісанкі ў аграгарадку Сапоцкін Гродзенскага раёна можна пазнаёміцца з рэдкай тэхнікай роспісу яек, паўдзельнічаць у майстар-класах, набыць сувенірную прадукцыю.

Прыкладам беражлівых адносін на Гродзеншчыне да беларускіх традыцый з'яўляецца творчасць майстроў па вырабе нацыянальных музычных інструментаў. Адным з унікальных майстроў з'яўляецца Мар'ян Скрамблевіч з аграгарадка Адэльск.

Яскравы прыклад рэгіянальных традыцый у ткацтве Гродзеншчыны — пяць элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія былі ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Адным са шляхоў выяўлення такіх элементаў з'яўляецца правядзенне фальклорных фестываляў, яскравае таму пацвярджэнне — абласны фестываль рэгіянальнага фальклору «Панямоння жыватворныя крыніцы», святы рамеснікаў «Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня» і «Казюкі», а таксама рэгіянальны фестываль традыцыйнай культуры «Скарбы Гродзеншчыны», які адбыўся ў канцы ліпеня ў Свіслачы. Гэтая культурная праява падкрэслівае адметнасць нашага прыгранічнага рэгіёна, сведчыць пра адзіную гістарычную спадчыну беларусаў, палякаў, літоўцаў.

Дарэчы, на Гродзеншчыне жывуць прадстаўнікі каля 30 нацыянальных супольнасцяў, якія захавалі і захоўваюць свае этнічныя адметнасці. Развіццё этнакультурнага турызму — этнаграфічныя вёскі, вуліцы майстроў з адпаведнай аўтэнтычнасцю ці стылізацыяй, шматвекавыя традыцыі народаў і этнасаў шматлікіх краін свету прыцягваюць значную ўвагу замежных і айчынных турыстаў. Этнічны турызм — гэта падарожжы ў мэтах вывучэння, далучэння да традыцыйнай культуры народаў, іх бытавога ўкладу і спосабу жыцця.

Шматнацыянальнасць і шматканфесійнасць вобласці азначае, што культурныя адрозненні існуюць і ўнутры яе — таму дыялог культур непазбежны, ён з'яўляецца важным фактарам выпрацоўкі новых каштоўнасцяў і новых стратэгій развіцця. Рэгіянальная палітыка ў галіне культуры павінна быць накіравана на фарміраванне ў людзей рэгіёна разумення і ўзаемапавагі паміж нацыямі, культурамі, рэлігіямі на разуменне не толькі правоў, але і абавязкаў у дачыненні адно да аднаго. Гэтая ўсталёўка павінна з'яўляцца дамінантай рэгіянальнай палітыкі ў галіне культуры.

***— І напрыканцы: што б вы пажадалі Прынёманню і яго жыхарам з нагоды юбілейнай даты?***

— Каб наш рэгіён быў заўсёды квітнеючы і працягваў утрымліваць лідарскія пазіцыі ў краіне. Няхай у ім каласуюць нівы, усміхаюцца дзеці і ярка свеціць сонца! З нагоды 75-годдзя вобласці хачу пажадаць усім яе жыхарам моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту і здзяйснення ўсіх мараў. Няхай упэўненасць і стабільнасць натхняюць на новыя здзяйсненні! А кожны новы дзень будзе напоўнены шчасцем і радасцю!

**Вольга АНУФРЫЕВА.**



## Гродзеншчына: ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

✓ **20 верасня спаўняецца 75 гадоў са дня стварэння Гродзенскай вобласці.**

✓ Сёння Прынёманскі рэгіён складаюць абласны цэнтр, 14 гарадоў раённага значэння, 16 гарадскіх пасёлкаў, 17 раёнаў, 155 сельсаветаў і 4295 сельскіх населеных пунктаў.

✓ **Гродзенская вобласць займае 25,1 тысячы квадратных кіламетраў (ці 12,1 % агульнай плошчы краіны) і з'яўляецца самай малой па плошчы вобласцю ў Беларусі.**

✓ Сярод раёнаў самым вялікім па тэрыторыі з'яўляецца Гродзенскі (10,3 % плошчы вобласці), самым малым — Бераставіцкі (усяго 3 %).

✓ **На пачатак 2019 года ў рэгіёне жыло 1 мільён 39,3 тысячы чалавек (11 % ад агульнай колькасці насельніцтва краіны).**

✓ Кожны трэці жыхар вобласці пражывае ў Гродне.

✓ **На 1000 мужчын на Гродзеншчыне прыходзіцца 1142 жанчыны: у гарадах — 1162, на вёсцы — 1083 прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва.**

✓ У 2018 чаканая працягласць жыцця склала 74 гады: у мужчын — 68,6, у жанчын — 79,2 года.

✓ **На пачатак 2019 года колькасць дзяцей да 17 гадоў склала 210,8 тысячы чалавек (20,3 % ад агульнай колькасці насельніцтва). На 1000 дзяўчынак прыходзілася 1053 хлопчыкі.**

✓ У 2018 годзе на Гродзеншчыне нарадзілася 5,5 тысячы хлопчыкаў і 5,1 тысячы дзяўчынак. Стала больш нараджацца трэціх і наступных дзяцей.

✓ **За апошнія 10 гадоў у галіне адукацыі ўведзены ў эксплуатацыю 21 дзіцячы сад-яслі і 9 школ.**

✓ На пачатак года ў Прынёманні функцыянавала 297 бібліятэк, 19 музеяў, 10 кінатэатраў, тры тэатры і заапарк.

✓ **Займацца фізічнай культурай і спортам дазваляюць 3,4 тысячы фізкультурна-спартыўных збудаванняў, якія функцыянуюць у рэгіёне.**

✓ У эканоміцы вобласці занята 436 тысяч чалавек (10,7 % ад агульнай колькасці занятых у эканоміцы краіны).

✓ **Больш за палову занятага насельніцтва вобласці летась працавала ў сферы паслуг.**

✓ У агульнай колькасці рабочых дамінуюць мужчыны (56,5 %), сярод служачых — наадварот, больш жанчын (71,4 %). Пры гэтым кіраўнікоў-мужчын больш, чым кіраўнікоў-жанчын, на 3,1 %.

✓ **Сярэдні ўзрост працуючых на канец 2018 года — 42,5 года.**




***ПЕРАД УСІМ.***

*Добра кухарам: нешта смачнае прыгатавалі, — амаль тут жа атрымалі падзяку...*

*Людзям, якія пішуць, на нешта падобнае разлічваць цяжка. Ну хіба зрэдку.*

*Пасля мінулага выпуску рубрыкі («Звязда», нумар за 13 верасня) патэлефанавала чытачка, сказала, што найлепшы творык атрымаўся ў спадарыні Навоенкі з Глыбоччыны «Танцуй... Пакуль не замужам»; што другая гісторыя «Паэзія і проза жыцця» (пра дэфіцыт, можна сказаць, на ўсё...) нагадала ёй, як сын прыехаў з войска ў водпуск, і прывёз ёй з Масквы (!) два пачкі пральнага парашку... А трэцяя — «Дзякуй... Ёсць за што? Ці няма?» (пра бацьку, які пасля чатырох дачушак прычакаў сынка) — навяла на сумны роздум, што з такіх вось, як правіла, спешчаных сынкоў, вельмі рэдка вырастаюць годныя людзі. А таму — можа, і добра, што з чалавека загадзя збілі пыху...*

*Тры вясёлыя і праўдзівыя гісторыі — ад чытачоў... Чытачам. На ўсмешку, на роздум, на ўспамін пра нешта сваё, на знаёмства, а то і сяброўства...*

*Пішыце! І чытайце новыя дзве.*

## ЛЮБАЧКА

Гэтай дачніцы зайздросцілі ўсе суседкі, бо ў яе муж — ну хоць да раны прылажы: не курыць, не п'е, з усімі далікатны, ветлівы. А ўжо што жоначку любіць, дык пра тое і размовы няма. Толькі і чуеш: Любачка ды Любачка!

Яна пра свайго чалавека таксама нічога дрэннага нікому не казала, толькі ўсміхалася, калі яго хвалілі... Хоць і адчувала, відаць, што гэта з падколкай: маўляў, ах, які твой Мікола, як выглядае. Яму што — пад шэсцьдзясят? Ніколі не дасі!

А вось Любачцы — гэта лёгка, бо яна трохі старэйшая за мужа і час яе прыгажосці даўно мінуў. Вырасла адзіная дачушка, жыве зусім іншым жыццём і нават у іншай краіне. А бацькі вось тут. Дачы ў нас побач былі, таму што-ніштo заўсёды чуваць. Вясной, напрыклад, Мікола ветліва прасіў сваю жонку:

— Ты ўжо, Любачка, пастарайся: ускапай, пасадзі ўсё... Ты ведаеш, я дапамог бы, але ж у мяне работа — яна забірае і час, і сілы.

Любачка гэта, відаць, разумела і штодня, сама — прычым з ранку да вечара — кешкалася ў гародзе. Муж прыязджаў хіба што ў нядзелю — вясёлы, бадзёры. З усімі вітаўся, усім усміхаўся, з жонкай вечарам піў гарбату пад вішняю, ды яшчэ і нахвальваў:

— Ах, якое смачнае ў нас варэнне з суніц... А маёй маме і сястры такога навараць? Ты ўжо, Любачка, пастарайся...

За варэннямі наставала пара так званых закатак. З імі гэтай суседцы таксама ніхто не памагаў, бо муж ездзіў у госці да сваёй радні. Водпуск жа, казаў, у чалавека толькі адзін...

Жонка, як выглядала, разумела і гэта. Але ж неяк «падвяла» свайго Міколу: узяла ды прастудзілася, падхапіла запаленне лёгкіх. Я праведвала яе ў бальніцы і аднойчы заспела там мужа. Ён сядзеў каля ложка, глядзеў на Любачку і старанна еў вялікі прыгожы яблык. Яшчэ два, праўда, горшыя, ляжалі на тумбачцы. А болей хворай ён нічога не прынёс...

Праўда, перад выпіскай папрасіла, папрасіў, каб мы з мужам па-суседску выручылі — спачатку дапамаглі прыгатаваць абед (бо трэба ж яго любую па-людску сустрэць), а потым — і ўсе разам — пасядзелі...

Пакуль я тупала па кухні, Мікола паставіў талеркі, адкрыў слоікі з закаткамі і са смакам з'еў... усе мандарыны, што купіў да агульнага стала.

Любачка прыехала на таксі. Мужу (на твары было напісана) гэта не спадабалася, але ён (ва ўсякім разе пры нас) не сказаў ёй нічога. Усе разам мы селі за стол, налілі па кілішку віна, сталі закусваць...

— Любачка, табе мяса шкодна, — сказаў муж, падчапіў відэльцам катлету з яе талеркі і палажыў сабе ў рот.

Тое ж зрабіў і з другой катлетай. Жонка пачырванела і моўчкі пацягнулася па агурок.

— Правільна, мілая, — пахваліў яе муж, — агурочкі карысныя. І грыбочкі еш. Яны табе вельмі ўдаліся, у іх селену шмат.

А потым ужо нам з мужам:

— Ведаеце, суседзі, берагу яе як магу! Прашу, каб болей рухалася, сачу за ежай...

Гаспадыня тым часам па нешта схадзіла ў кухню. Муж ёй тут жа:

— Любачка, ты кран не закрыла... Я ж чую — вада цячэ... Вярніся — закруці.

Мы з поўнымі чаркамі пачакалі. Аднак не паспела жонка прыйсці, як Мікола зноў ёй даў даручэнне:

— Любачка, а што гэта ў прыбіральні святло гарыць? Нехта забыўся выключыць? Дык ты схадзі...

Карацей, назаўтра мне хацелася спытаць суседак: ну як, жанчынкі, мы і далей будзем зайздросціць Любе? Ці ўсё ж прыглядзімся да сваіх мужоў ды падумаем (кожная пра свайго), што няхай ён «трохі курыць і тро-хі п'е»...

**З. М. Наваенка,**
*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

## НА ВАРЦЕ МАЁМАСЦІ

Гісторыі ў нашым «Правадзе...» найчасцей пра даўнейшае жыццё, але ж сённяшняе нічым не горшае: яно таксама ў рубрыку просіцца. На днях вось патэлефанаваў знаёмы. Пытаецца: «Хочаш гісторыю?» — «Ну вядома ж, хачу!»

Ён расказаў, я запісала. Такім чынам...

У адной вёсцы, што на Магілёўшчыне, жыве чалавек мо з дзесяцьь: усе — жанчыны, усе немаладыя, але ж варушацца, нешта садзяць, даглядаюць...

Зрэшты, гісторыя не пра іх, а, можна сказаць, пра гараджанку, якая, там нарадзіўшыся, пасля школы пераехала ў райцэнтр, а потым — нібы вярнулася, бо ў вёсцы ў спадчыну атрымала хату. Разы са два на год стала прыязджаць: першым разам — на Радуніцу, каб схадзіць на могілкі (гэта святое), а другім — трохі яблыкаў узяць. Хоць якія там яблыкі, калі садок хварэе ды дзічэе без руплівай рукі...

Вось і нядаўна села гэтая Ганна Пятроўна на ранішні аўтобус, дакалыхалася да вёскі, папрасіла кіроўцу, каб спыніўся ля хаты. Той паслухаў — высадзіў жанчыну (яна даўно ўжо на пенсіі), з'ездзіў на разварот (гэта побач) ды кіруе сабе назад. Бачыць — яго пасажырка, пастаяўшы трохі ля весніц, пераходзіць дарогу, галасуе, каб ехаць назад... Прычым, як потым дазналіся, зусім не дамоў, а ў... міліцыю, каб напісаць заяву, што ў вёсцы (адрас, вядома ж, «дадаваўся») яе... абакралі.

Што канкрэтна ўзялі, як быццам, напісаць не паспела, бо ёй дрэнна стала. Спалоханы дзяжурны выклікаў «хуткую», тая, мігам прымчаўшы, завезла (і пакінула) жанчыну ў бальніцу, бо хваробу ў такім узросце доўга шукаць не трэба... Ды і не знайсці яе ў гэтай пацыенткі проста не маглі: ведалі, што яна ў свой час працавала рэвізорам і лютавала, не раўнуючы нібы смерч! (Дужа прынцыповая была: сумку дэфіцытаў напакуюць — добры акт напіша, а калі не, дык і не...)

Ды што там: яе нават начальства баялася, бо кожнага ў Пятроўны «дасье» было.

...У міліцыі таксама пра гэта ведалі, а таму ў вёску тут жа, па гарачых слядах, накіравалі групу. Яна, прыехаўшы на месца злачынства, праз «джунглі» з бур'яну падышла да хаты, паглядзела, што замкі на дзвярах не зрэзаны, прабоі не вырваны, шыбы цэлыя (хіба кіт патрэскаўся), ды і вярнуліся ў аддзел — «адпісаліся», што ўзлому няма...

«Як гэта няма?! — дазнаўшыся пра гэта, стала абурацца пацярпелая. — Ды вы не праверылі!... Не даследавалі... Я скардзіцца буду!»

Што рабіць — аператыўная група зноў паехала ў вёску (Ганна Пятроўна, як пані, на пярэднім сядзенні). І зноў, ужо з панятымі з ліку мясцовых жанчын (яны не роўня гарадскім — па кутах хавацца не будуць) пайшлі да пацярпелай у хату. А там...

Што ёсць, тое ёсць: слой бруду — ляжыць, хоць карціны па ім пішы (новы від мастацтва быў бы). А ўзяць — ну няма чаго: каб і хацеў, не знойдзеш!

Міліцыя з панятымі на двор: можа, недзе там быў скарб закапаны? Заяўніца і сапраўды падыходзіць да плота ды кажа:

— Вось тут я ручнік вясною павесіла — акно выцірала... А цяпер яго няма, бачыце? Значыць, укралі!

Следчы, пачуўшы гэта, аж малінавы стаў (ад злосці), аператыўніку таксама мову адняло. Толькі шафёр аж зайшоўся ад рогату — ледзь адпоўз за машыну.

— Дык гэта ж ануча была, — успомнілі суседкі «пацярпелай». — Яе, відаць, ветрам знесла...

— Каму ануча, а мне — маёмасць, — заявіла Пятроўна.

...Кажуць, яе потым адвезлі дадому. А што ў міліцыі было, вёска, на жаль, не ведае. Чула толькі, у таго дзяжурнага людзі час ад часу пытаюць: «А што — ручнік яшчэ не знайшлі?»

**Л. М. Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

## Неасабісты суб'ектыў



# «Трагедыя з тэлефонам»

**Ад блазна да мярзотніка — адзін крок. Асабліва калі ніхто не спыніць**

ЯНІНА МІКАЛАЕЎНА напісала ў рэдакцыю ліст, якому дала назву «Трагедыя з тэлефонам». Гісторыя, расказаная ў ім, — амаль вясковы дэтэктыў. Сюжэт яе прыблізна такі. Наша чытачка была ў вёсцы. Зранку ў хату завітаў мясцовы выпівоха, які нідзе не працуе. Чаго хацеў — у лісце не сказана, але, добра ведаючы гэты кантынгент, можна з упэўненасцю сказаць, што або пахмяліцца, або па бутэльку. Жанчына, доўга не думаючы, няпрошанага госця выставіла за дзверы (якія гэтыя таварышы бываюць надакучлівыя, ведаюць усе, хто хоць аднойчы з імі сутыкаўся). Пакрыўджаны візіцёр сеў на веласіпед і з'ехаў, а Яніна Мікалаеўна праз нейкі час убачыла, што няма яе тэлефона, які ляжаў у пакоі на бачным месцы.

Далей дэтэктыў развіваўся па тыповым сцэнарыі. Пацярпелая (менавіта так сябе наша чытачка называе ў лісце) пазваніла ў міліцыю і паведаміла аб крадзяжы. Нарад з раёна прыехаў, затрымаў меркаванага злодзея, але ўкрадзенага пры ім міліцыянеры не знайшлі. Прывезлі дзецюка на месца крадзяжу і пачалі шукаць той няшчасны тэлефон. Шукалі ў двары, на кухні, у пакоях, нават у прыбіральні. Усюды, дзе ён мог яго схаваць, бо пра тое, што пажылая жанчына сама яго кудысь палажыла і забылася, версія адпала: апарат быў недаступны, а значыць, сім-карту з яго вынялі. «Злодзей, седзячы на лаўцы, толькі ўсміхаецца, пацярпелая просіць, каб ён аддаў тэлефон, але ён не прызнаецца...» Так і не знайшоўшы аб'екта правапарушэння, суб'екта правапарушэння міліцыя вымушана была адпусціць.

ПРАЎДА, праз пару дзён злодзей пракалоўся: падкінуў пад вароты сім-картку (наглядзеўся, пэўна, дэтэктываў, баяўся, што па ёй знойдуць), а брат нашай чытачкі заспеў яго на гэтым. Зноў выклікалі міліцыю, і небарака прызнаўся-такі, куды дзеў украдзенае: мабільнік ляжаў у кветніку ў двары пацярпелай. Тэлефон забралі і адправілі на экспертызу, а злодзея праз нейкі час... зноў адпусцілі. Крымінальную справу заводзіць не сталі, бо высветлілі, што ўкраў ён яго не з мэтай атрымаць матэрыяльную выгаду, а з помсты за тое, што яго выгналі з хаты. Мабільнік, лежачы ў кветніку, мог сапсавацца, і гэта ўжо матэрыяльная шкода, але да крымінальнай справы таксама не дацягвае — занадта нязначны ўрон: экспертыза ацаніла не новы прасценькі апарат у шаснаццаць рублёў. Засталася пасля гэтага крыўда на міліцыю і пытанне: ці ўсё яны рабілі правільна, абшукваючы хату, доўга трымаючы ў сябе мабільны? З гэтым і напісала Яніна Мікалаеўна ў газету.

Мы яе ліст пераадрасавалі абласным начальнікам тых міліцыянераў. Няхай сапраўды разбяруцца, ці ўсё было законна і па-чалавечы, тым больш што менавіта «па-чалавечы» пасля нарады з сілавікамі ў Прэзідэнта сёння выходзіць на першы план... Мяне асабіста больш цікавіць другі галоўны герой гэтай «трагедыі з тэлефонам» — той самы выпівоха Валодзя, які напаскудзіў, папсаваў нервы пажылому чалавеку, заняў па сутнасці і па выніку бессэнсоўнай справай міліцыянераў, якія ў гэты патрачаны без толку час маглі б сапраўды камусьці дапамагчы. Валодзя — у шакаладзе, бо для яго ўсё скончылася лёгкім спалохам, пра які ён будзе весела расказваць сваім сабутэльнікам. Больш за тое, ведаючы гэтую гісторыю, вяскоўцы (у большасці сваёй пажылыя, а значыць, у нечым безабаронныя людзі) ужо не стануць гнаць яго з хаты, калі прысунецца па чарку ці грошы, а будуць старацца яго ўлагодзіць, каб і з імі не нарабіў падобнага паскудства, якое не пацягне на пакаранне па законе, але якое ад гэтага не перастане быць паскудствам.

ШТО ёсць, тое ёсць — вясковыя выпівохі сёння ператварыліся з блазнаў, з якіх больш смяюцца, чым ад якіх гаруюць, і якія больш ствараюць праблем сабе і сваёй сям'і, але не навакольным (як было, пэўна, спрадвеку), у дробных мярзотнікаў, выбрыкі якіх датычацца менавіта старонніх людзей і зусім не бяскрыўдныя. Чаму так сталася? Я думаю, адчуваючы сваю беспакаранасць. Не з боку міліцыі — участковага яны баяцца і сёння, але часта яму няма чаго прад'явіць ім, бо ўсе іх агідныя ўчынкі дробныя, не цягнуць нават на правапарушэнне. Яны перасталі баяцца самага галоўнага — людскога асуджэння і, калі што якое, — адпаведнай рэакцыі. Бо калі б знайшоўся сваяк, сусед — хто заўгодна, які б за фактычны здзек з пажылой жанчыны даў таму Валодзю... не, не балюча, і нават не па мордзе, а проста выспятка пад зад, той, думаю, надоўга б зарокся штосьці падобнае чыніць. А так — ён амаль што герой...

Хтосьці тут захоча запярэчыць збітымі фразамі пра старэнне і дэградацыю вёскі, маўляў, каму там заступацца, калі толькі старыя ды выпівохі засталіся? Але нават у самую закінутую далёкую вёску, нават калі ў ёй сапраўды няшмат насельнікаў, прыязджаюць сваякі ды дачнікі. (А вёска, пра якую піша Яніна Мікалаеўна, вялікая і не пустая — ферма працуе, да таго ж ад Мінска недалёка). Але сваякам і дачнікам сёння папросту ўсё роўна — абы мяне не чапалі, а то скажу што «алкашыку», а ён у мяне пасля цыбулю патопча ці мыш у калодзеж укіне. Хай сабе робіць што хоча — нікога ж, не дай бог, не забіў, не пакалечыў. А што бабкам мясцовым сваімі выкрунтасамі жыццё не дае — дык хай лепш выпіць яму дадуць, ён і супакоіцца...

У нашай вёсцы гадоў пятнаццаць таму быў вельмі паказальны выпадак. Прыехаў у закінутую бабуліну хату гарадскі унучак — бамбіза гадоў пад сорак, які нядаўна вызваліўся з калоніі. Прывёз з сабой чалавек пяць дружбакоў-сабутэльнікаў. Заявіў: буду тут жыць, і за некалькі дзён затэрарызаваў усіх мясцовых бабуль. Мала таго: нашы ціхія мясцовыя выпівохі, якія да гэтага былі сапраўды бяскрыўдныя, бачачы беспакаранасць гарадскіх, таксама сталі нахабныя і хамаватыя.

Управа на іх знайшлася вельмі хутка. Мясцовы прадпрымальнік, у якога ў вёсцы жывуць маці і цешча, сабраў чалавек пяць моцных хлопцаў, падагнаў мікрааўтобус, загрузілі яны прыезджых, вывезлі за межы раёна і высадзілі ў чыстым полі. Натуральна, «госці» болей не вярнуліся. А мясцовыя адразу пацішэлі, і з таго часу ў нас спакойна. І тэлефон можна класці нават на лаўцы на двары, і ніхто на яго не пакваліцца...

...ШТО, атрымалася, я зноў пра чалавечую абыякавасць і наадварот? Не судзіце строга: амаль усё ў нашым жыцці — менавіта іх наступствы.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

на 1 июля 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | На 01.07.2019 | На 01.01.2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 57 620 | 68 381 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 419 | 334 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 432 787 | 466 250 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 176 554 | 217 825 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 750 641 | 737 935 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 2 681 786 | 2 588 276 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 211 | – |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | 112 | 108 |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | – | – |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 790 | 790 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 157 369 | 160 442 |
| 13 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 4 | – |
| 14 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 928 | 936 |
| 15 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 14 | 12 |
| 16 | Деловая репутация | | – | – |
| 17 | Прочие активы | 1113 | 31 454 | 27 924 |
| 18 | ИТОГО активы | 11 | 4 290 689 | 4 269 213 |
| 19 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 20 | Средства Национального банка | 1201 | 20 | 22 |
| 21 | Средства банков | 1202 | 1 328 197 | 1 369 041 |
| 22 | Средства клиентов | 1203 | 2 302 247 | 2 204 980 |
| 23 | Ценные бумаги банка | 1204 | 50 278 | 102 989 |
| 24 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 244 | – |
| 25 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | 71 | 65 |
| 26 | Прочие обязательства | 1207 | 48 557 | 49 626 |
| 27 | ВСЕГО обязательства | 120 | 3 729 614 | 3 726 723 |
| 28 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 29 | Уставный фонд | 1211 | 117 408 | 117 408 |
| 30 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 31 | Резервный фонд | 1213 | 65 900 | 65 899 |
| 32 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 55 538 | 53 305 |
| 33 | Накопленная прибыль | 1215 | 322 229 | 305 878 |
| 34 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации | | 561 075 | 542 490 |
| 35 | Доля неконтролирующих акционеров | | – | – |
| 36 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 561 075 | 542 490 |
| 37 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 4 290 689 | 4 269 213 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибылях и убытках

за 6 месяцев 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | За 6 месяцев 2019 года | За 6 месяцев 2018 года |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 139 583 | 141 169 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 68 386 | 64 454 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 71 197 | 76 715 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 49 013 | 49 219 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 16 166 | 17 464 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 32 847 | 31 755 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 97 | 53 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 82 | 230 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 8 379 | 7 147 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (1 398) | (28) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 26 221 | 12 120 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 6 692 | 5 916 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 66 892 | 69 584 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 8 336 | 4 509 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 16 447 | 35 575 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 127 | 7 817 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 16 320 | 27 758 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | 4 | – |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | – | – |
| 20 | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | 16 324 | 27 758 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации | | 16 324 | 27 758 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | – | – |
| 23 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | |
| 24 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | – | – |
| 25 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | – | – |

Председатель Правления банка В.С.Матюшевский

И.о. главного бухгалтера Л.А.Филиппова

Дата подписания: 27 августа 2019 г.

Бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность за 2019 год, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь».

*ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 21.12.2018 № 6. УНП 100010078.*

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**сообщает о проведении 01.10.2019 повторного открытого аукциона (цена снижена на 50 %)**

Лот № 1: **Капитальное строение с инв. № 700/С-67967 — Здание механических мастерских**, площадь — 262,8 кв. м, адрес: г. Могилев, ул. Островского, 64. **Склад металлический с бухг. инв. № 70024**, площадь — 225,5 кв. м, адрес: г. Могилев, ул. Островского, 64. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91627 — Склад,** площадь — 163,9 кв. м, адрес: г. Могилев, ул. Островского, 64/2. **Станок токарный 1к-62**, инв. № 882; **Станок токарно-винторезный 1к-62 Б**, инв. № 1038; **Станок токарный 163**, инв. № 1095482; **Станок поперечно-строгальный 7Д36** с гидравлическим приводом, инв. № 1095483; **Станция обезжелезования**, инв. № 071006; **Трансформатор, тип ТМ — 400**, инв. № 453; **Трансформатор, тип ТМ — 400**, инв. № 852; **Станок обдирочно-шлифовальный, модель 3м636**, инв. № 1099300; **Станок деревообрабатывающий КСМ-1А**, инв. № 1099091; **Станок заточной модель 3В642**, инв. № 1099301; **Гидравлический пресс ПСУ-10**, инв. № 1099302; **Автомат этикетировочный GERNEP**, инв. № 3915; **Парогенератор ПЭЭ-250**, инв. № 071007; **Компрессор с электрическим двигателем, тип NF-611** в количестве 2 шт., инв. № 1099303; **Автомат розлива по уровню Т1-ВР2Щ**, инв. № 3149; **Трансформатор Тип ТМ — 400/10-75у1**, инв. № 071003; **Участок теплотрассы протяженностью 7,0 м** (инвентарный № 700/С-99163), расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского; **Участок наружной канализации протяженностью 102,9 м** (инвентарный № 700/С-90642), расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского; **Участок наружного водопровода протяженностью 34,8 м** (инвентарный № 700/С-90643), расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Островского. **Сведения о земельных участках:** земельные участки с кадастровым номером 740100000005005429 (площадь — 0,2210 га) и 740100000005003398 (площадь — 0,4349 га). Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен.

***Начальная цена продажи: 137 468,01 бел. руб. с учетом НДС***
***Сумма задатка: 13 746,80 бел. руб.***

**Дата, время и место проведения аукциона: аукцион состоится 1 октября 2019 года в 12.30** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесения задатка: по 30.09.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182,
р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Могилевоблпищепром», УНП 700391109, 212029, г. Могилев, ул. Островского, 64

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона, в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 02.02.19, 19.03.19, 10.04.19, 03.05.19, 30.05.19, 06.07.19, 07.08.19

Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел. +375 222 72-41-14, Mogilev@ino.by
**Дополнительная информация по тел.: +37529-624-26-25; +37529 550-09-56, на сайте ino.by**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДОРОРС» (Продавец), расположенного в г. Орша, ул. Мира, 71**

**Лот № 1, состав:** 1. Здание магазина, № 43, инв. № 240/С-28899. Площадь — 2162,8 кв. м. Г. п. — 1989. 2. Электрические сети, инв. № 240/С-29803.Протяженность — 165 м. Земельный участок: кадастровый номер 242400000001004376, площадь — 0,1949 га. Право постоянного пользования. Начальная цена с НДС — 365 768,00 бел. руб. Задаток — 36 576,80 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.
Аукцион состоится **21.10.2019** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.
Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 21.10.2019 (ОАО «ДОРОРС», Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 17.10.2019 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.02.2019

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 ● www.ino.by ● e-mail: torgi@ino.by**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС» (Продавец), расположенного по адресу: г. Орша, ул. Сергея Грицевца, 16**

**Лот № 1, состав:** 1. Здание проходной хлебозавода, инв. № 240/С-30357, площадь — 102 кв. м. 2. Здание хлебопекарни, инв. № 240/С-31313, площадь — 1321,9 кв. м. 3. Здание склада хлебозавода, инв. № 240/С-30355, площадь — 241,8 кв. м. 4. Здание мазутонасосной, инв. № 240/С-45934, площадь — 30,8 кв. м. 5. Сооружения в составе инженерных сетей (водопроводная, канализационная, тепловая, электрические сети и ограждения). Обременение: — аренда части здания хлебопекарни с инв. № 240/С-31313 до 30.10.2019 (площадь — 93,6 кв. м.); — аренда части здания проходной хлебозавода с инв. № 240/С-30357 до 30.10.2019 (площадь — 102,0 кв. м). Земельный участок: кадастровый номер 242400000001005543, площадь — 0,7979 га. Право постоянного пользования. Начальная цена с НДС — 80 949,00 бел. руб. Задаток — 8 095,00 бел. руб.
**Лот № 2, состав:** 1. Здание административно-бытового корпуса хлебозавода, инв. № 240/С-30346, площадь — 657,1 кв. м. 2. Тепловая сеть и ограждение. Земельный участок: кадастровый номер 223650100001015496, площадь 0,1182 га. Право постоянного пользования. Начальная цена с НДС — 49 065,50 бел. руб. Задаток — 4 906,55 бел. руб.
Аукцион состоится **18.10.2019** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона — 5 %.
Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 18.10.2019 (ОАО «ДОРОРС», Лот №__). Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 16.10.2019 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.03.2019

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 ● www.ino.by ● e-mail: torgi@ino.by**

## Извещение о проведении 4 октября 2019 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»

**Сведения о продаваемом имуществе:**

| Лот | Информация о предмете торгов | Стартовая цена, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| № 1 | Изолированное помещение площадью 5435,1 кв. м с целевым назначением – помещение бытового обслуживания населения, наименование – гостиничный комплекс «Светлогорск», с инвентарным номером 342/D-186150, расположенное по адресу: Гомельская область, г. Светлогорск, ул. Ленина, д. 41-1. Движимое имущество, необходимое для эксплуатации изолированного помещения, с инвентарным номером 342/D-186150, расположенное по адресу: Гомельская область, г. Светлогорск, ул. Ленина, д. 41-1. Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-122265 площадью 27400,0 кв. м, назначение – Сооружение неустановленного назначения, наименование – Сооружение асфальтобетонной площадки строительного, продовольственного, автомобильно-вещевого рынков. Местоположение: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо. Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-122278 площадью 24630,3 кв. м, назначение – Сооружение многофункциональное, наименование – Площадка оптовой и розничной торговли с гостевой стоянкой и зоной сервиса. Местоположение: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо | 14 180 121,76 | 141 801,22 |

**Продавец имущества:** Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.
**Организатор торгов:** Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф.1703.
Торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию Свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.
Задаток перечисляется на расчетный счет Консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» № BY23BAPB30122013100380000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 190982374, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном условиями проведения торгов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 60 банковских дней со дня проведения торгов.

**Торги проводятся 4 октября 2019 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 22, оф. 1703.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 20.09.2019 по 30.09.2019 включительно, в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 16.15 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф. 1703.
Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.zalogbanka.by, mail: torgi@agroconsult.by.
Телефоны для справок: организатор аукциона: Tel/Fax 8 (017) 399 66 39, GSM MTS 8 (029) 816-64-46, GSM VEL 8 (044) 540-64-46.

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690-54-09, **BELTORGI.BY**
Продавец: ООО «Стройдормашлизинг» (УНП 190799737) в лице управляющего по банкротству ООО «Зовель», тел. +375 (29) 179-02-40.
Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены: **7 октября 2019 г. 09.00—17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.** Предмет торгов — **шагающий экскаватор ЭШ 6,5/45-У, б/у, 1988 г. в.** Начальная цена — 265 318,20 бел. руб. без НДС, шаг торгов — 5 %, задаток — 10 % от начальной цены предмета торгов. Местонахождение — карьеры в Чашникском р-не Витебской обл., телефон для ознакомления и осмотра +375 29 698 53 18.
Для участия в торгах необходимо в срок по 4 октября 2019 г. 17.00 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель — ЗАО «Белреализация».
Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 03.09.2019 г.

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Вы ў стане вырашыць свае праблемы самі, і пачаць тут трэба з таго, каб прынамсі не ствараць лішніх праблем іншым — адразу стане лягчэй. Не прыбядняйцеся, ваша энергія б'е ключом, прычым ва ўсіх напрамках. Час ажыццяўляць даўнюю мару і не баяцца штосьці змяніць.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні варта часцей праяўляць разважлівасць і пільнасць. Пажадана сачыць за сваімі выказваннямі, вы можаце стаць не ў меру гаваркімі, а гэта нікому яшчэ не прыносіла карысці. Нестандартны падыход да вырашэння працоўных задач дасць станоўчы вынік. Асноўная задача на выхадныя — гэта ахова свайго прыватнага жыцця ад чужых вачэй.

**БЛІЗНЯТЫ.** Пакіньце нарэшце ў спакої стэрэатыпы адносін, якія склаліся, і паспрабуйце быць больш натуральнымі і працейшымі. І вы нечакана здабудзеце шчасце і гармонію ў каханні. Пачатыя ў сераду справы будуць паспяховыя — не прапусціце гэты момант. У чацвер вы можаце быць залішне ўзбуджальныя і раздражняльныя праз тое, што ўсё ідзе не так, як хацелася б. Аднак хутка высветліцца, што ўсё да лепшага.

**РАК.** Вы цяпер у цэнтры ўвагі, поўныя сіл і энергіі. Не імкніцеся выправіць свае і чужыя памылкі, а паспрабуйце атрымаць карысны ўрок і чакайце змен. Задуманае атрымаецца ўвасобіць у жыццё, калі вы пераўтворыце сваё абурэнне ў дзелавую актыўнасць. Няўдачы — вынік вашых спроб выйсці на новы ўзровень жыцця, гэта нармальна і значыць, што вы паступова прасоўваецеся ў патрэбным кірунку.

**ЛЕЎ.** Не варта рэагаваць на патрабаванні начальства занадта эмацыянальна. Паберажыце свае нервы. Вы знойдзеце дыпламатычны спосаб сысці ад непрыемнасцяў і здолееце дамагчыся патрэбнага вам рашэння. У аўторак лепш пазбягаць зносін з незнаёмцамі. У чацвер упартая праца прынясе хуткі поспех, можаце паспець зрабіць многае, у вас нібы адкрыецца другое дыханне.

**ДЗЕВА.** Ваша дзелавая актыўнасць будзе на вышыні. З панядзелка да серады не варта займацца рэарганізацыяй бізнесу, прызначаць сур'ёзныя дзелавыя сустрэчы. Чым больш задач вы перад сабой паставіце бліжэй да выхадных, тым лепш з імі справіцеся, а вашы працаздольнасць, прадпрымальнасць і ўпэўненасць у сабе могуць стаць нават прычынай зайздрасці.

**ШАЛІ.** Тыдзень абяцае прынесці пазітыўныя тэндэнцыі ў многія справах. Але свае планы і намеры лепш захаваць у тайне, калі вы зацікаўлены ў іх ажыццяўленні. У панядзелак, магчыма, давядзецца вытрымаць напады нядобразычліўцаў. У аўторак магчыма з'яўленне заступніка або ўплывовай асобы, і гэта дасць штуршок вашай кар'еры. Пятніца адзначыцца выгаднымі прапановамі. У суботу паспрабуйце выбрацца куды-небудзь у госці ці запрасіце каго-небудзь, і прыемныя зносіны вам забяспечаны.

**СКАРПІЁН.** Вам цяпер неабходна праявіць сваю актыўнасць і веру ў лепшае, важна сачыць за развіццём сітуацыі і не выпусціць ініцыятыву. У справах вас чакае поспех і прыбытак. У асабістым жыцці не бойцеся шчырых прызнанняў, калі вы сапраўды адчуваеце да выбранніка нешта асаблівае.

**СТРАЛЕЦ.** Панядзелак можа парадаваць добрымі падзеямі. У аўторак і чацвер на рабоце лепш не прыцягваць да сябе ўвагі. Сачыце за тым, каму і што кажаце. У сераду будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі, але асцерагайцеся абяцанняў, якія ніхто не спяшаецца выконваць. Не забывайце пра дом. У выхадныя паспрабуйце аддаць больш часу і ўвагі блізкім людзям.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні будзьце асцярожныя ў дачыненні да калег і сяброў, бо яны могуць падвесці або перакласці на вас усю адказнасць. Каб тыдзень аказаўся паспяховым, не варта расказваць пра свае планы навакольным. У пятніцу будзе важна не адмаўляць у адказ на просьбу і выконваць работу, за якую беряцеся, своечасова.

**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні вам можна ўздыхнуць з палёгкай — многае становіцца на свае месцы, і справы, падобна, наладжваюцца. Прымайце дзелавыя прапановы, гэта можа прынесці прыбытак. Але не выключана, што трэба будзе зрабіць нейкі выбар. У чацвер падзеі падштурхнуць да змены тактыкі, і стрымліваць эмоцыі стане складаней. У пятніцу пажадана не ўблытвацца ў авантурныя або сумнеўныя гісторыі. Субота — удалы дзень для паездак, падарожжаў, як блізкіх, так і далёкіх.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні імаверныя пэўныя рознагалоссі з партнёрамі. Пераадолеўшы іх, вы можаце атрымаць шматабяцальныя прапановы ў бізнесе. Некаторыя праблемы могуць запатрабаваць неадкладнага вырашэння, што прымусіць задумацца над сітуацыяй, якая склалася. Калі блізкія людзі робяць нешта для вас, клапоцяца, дык радуйцеся і прымайце гэта з удзячнасцю, а не як належнае. Калі раптам вы задумалі змяніць месца жыхарства, паспрабуйце не спяшацца з рэалізацыяй гэтай думкі, прынамсі, да наступнага тыдня. Вам могуць нагадаць пра абавязкі, у тым ліку і маральныя, — не прымушайце нагадваць двойчы.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.51 | 19.14 | 12.23 |
| Віцебск — | 6.40 | 19.04 | 12.24 |
| Магілёў — | 6.41 | 19.04 | 12.23 |
| Гомель — | 6.38 | 19.00 | 12.22 |
| Гродна — | 7.06 | 19.30 | 12.24 |
| Брэст — | 7.07 | 19.30 | 12.23 |

### Месяц

*Поўня 14 верасня.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

*Пр.* Івана, Лукі, Мікалая, Рыгора, Сцяпана, Яўгена.
*К.* Філіпіны, Андрэя, Паўла, Філіпа, Францішка.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 20 ВЕРАСНЯ




**1910** год — нарадзіўся Аляксей Васілевіч Лыкаў, беларускі вучоны ў галіне цепла- і масапераносу, акадэмік НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар. У 1956—1974 гадах — дырэктар Інстытута цепла- і масаабмену АН БССР, адначасова ў 1968—1974-м — прафесар, загадчык кафедры БДУ. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, прэміі імя І. І. Палзунова АН СССР. Аўтар больш чым 230 навуковых прац, у тым ліку 18 манаграфій, 12 вынаходак. Памёр у 1974 годзе. Імем А. В. Лыкава названы Інстытут цепла- і масаабмену НАН Беларусі.

**1929** год — у Слоніме адкрыўся краязнаўчы музей. Заснаваў яго мясцовы археолаг і краязнаўца Язэп Стабровскі на базе асабістай калекцыі, якую збіраў больш за 50 гадоў. Ён быў першым дырэктарам музея і выратаваў яго асноўныя фонды ў гады вайны. Экспанаты музея адлюстроўваюць флору і фауну, карысныя выкапні раёна, апавядаюць пра гісторыю краю ад старажытнасці да нашых дзён. Цяпер музей носіць імя свайго заснавальніка.

**1944** год — у Беларусі створаны новыя вобласці — Бабруйская і Полацкая; Беластоцкая вобласць пераўтворана ў Гродзенскую, Вілейская — у Маладзечанскую.

**1944** год — Надзвычайная дзяржаўная камісія зрабіла паведамленне пра зверствы гітлераўскіх акупантаў у Мінску.

**1945** год — у Мінску для наведвальнікаў адкрыты Літаратурны музей Янкі Купалы. Першапачаткова музей размяшчаўся ў некалькіх пакоях Палаца культуры прафсаюзаў. Сучасны будынак музея пабудаваны ў 1960 годзе на месцы невялікага драўлянага дамка, у якім паэт жыў да вайны.




**1519** год — пачалося першае кругасветнае плаванне экспедыцыі Фернанда Магелана, у выніку якога былі шарападобнасць Зямлі і наяўнасць адзінага Сусветнага акіяна. Экспедыцыя была ўкамплектавана вялікай камандай (па розных ацэнках 265—280 чалавек) на пяці суднах. У выніку мяцяжоў, цяжкага перасячэння Ціхага акіяна і сутычак з насельніцтвам Філіпін і астравоў каманда моцна скарацілася. Толькі аднаму судну — «Вікторыя» — удалося вярнуцца ў Іспанію, маючы 18 чалавек на борце. Экспедыцыя пры ўсім гэтым была вельмі паспяховая ў камерцыйным плане, прынесла арганізатарам вялікі прыбытак. Завяршылася яна 9 верасня 1552 года.



**1874** год — нарадзіўся Мікалай Аляксандравіч Сямашка, савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, урач, адзін з арганізатараў савецкай аховы здароўя, акадэмік АМН СССР. У 1918—1930 гадах быў наркамам аховы здароўя РСФСР, з 1930-га — прафесар, загадчык кафедры 1-га Маскоўскага медыцынскага інстытута. У 1928—1936 гадах — таксама галоўны рэдактар «Вялікай медыцынскай энцыклапедыі». Аўтар прац у галіне сацыяльнай гігіены, арганізацыі аховы здароўя. Пад яго кіраўніцтвам праводзілася работа па барацьбе з эпідэміямі, створана сістэма аховы мацярынства і дзяцінства. Памёр у 1949 годзе.

**1934** год — нарадзілася Сафі Ларэн, італьянская актрыса кіно. Здымалася ў фільмах «Золата Неапаля», «Чочара», «Шлюб па-італьянску», «Сланечнікі», «Перавал Касандры» ды многіх іншых. Першы лаўрэат прэміі «Оскар» за лепшую жаночую ролю на замежнай мове (1961). Уладальніца ганаровых прэмій усіх асноўных міжнародных кінафестываляў.

## УСМІХНЕМСЯ

**Размаўляюць два падабцаснікі:**
**— Уяўляеш сабе, мая ўчора мне кажа: «Памый бялізну!»**
**А я ёй: «Ды пайшла ты к чорту!.. Я яшчэ посуд не дамыў».**

— Я, Фіра, вядома, не найлепшы з найлепшых, але і вы не мамчын боршч!

**З сонніка.**
**Калі ўсю ноч сніцца багата накрыты стол — значыць ты не ясі пасля шасці.**

Дзеці — кветкі жыцця :)
Кірылу (5,5 года) задалі пытанне:
— Кірыл, уяві сабе, што тваю маму кланіравалі. Вось ты прыходзіш дадому, а там тры мамы. Як ты даведаешся, якая твая?
Кірыл, не задумваючыся:
— Мая — на кухні!

**Заўсёды май надзею на лепшае!**
**Нават калі цешча ўжо ў вітальні!**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3132.
Нумар падпісаны ў 19.30 19 верасня 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

20 верасня 2019 г. № 38 (523)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


СПЕЦВЫПУСК



Намеснік начальніка ўпраўлення кантрольнай работы інспекцыі МПЗ па Магілёўскаму раёну Наталля БАЛАШЭНКА.

Фота БЕЛТА.

# Багатыя прадпрыемствы — квітнеючая краіна

## У Магілёве разглядалі, як працуе новы Падатковы кодэкс і ці патрэбныя да яго карэкцыроўкі

**Летась у дзеянне ўступіў новы Падатковы кодэкс, прызваны палепшыць існуючую ў краіне сістэму падаткаабкладання, зрабіць яе больш простай і дасканалай. Навукова-кансультатыўны савет, які працуе пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, прыехаў у Магілёў, каб высветліць, наколькі гэты заканадаўчы акт зручны для яго карыстальнікаў і карысны для бюджэту. Дэпутаты разам са спецыялістамі, вучонымі, прадстаўнікамі міністэрстваў на прыкладзе канкрэтных прадпрыемстваў і ведамстваў знаёміліся з тым, як працуюць новыя нормы і палажэнні, наколькі яны зразумелыя і цікавыя бізнесу, канкрэтным плацельшчыкам. Удзельнікам навукова-кансультатыўнага савета было важна даведацца, як змяніўся фінансавы стан суб'ектаў гаспадарання, наколькі эфектыўна паўплывалі змяненні на развіццё прадпрымальніцкай дзейнасці, а галоўнае, дзе і ў чым можна яшчэ гэтую сістэму палепшыць. Менавіта тэма ўдасканалення падатковага заканадаўства і стала галоўнай падчас пашыранага пасяджэння савета, якое адбылося па выніках сустрэчы з прадстаўнікамі дзелавых колаў, бізнесу, падатковых органаў.**

стар. 3

ВЫБАРЫ-2019

## Дзе можна прагаласаваць?

**Для галасавання на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання ўтвораны 5831 участак. Такая інфармацыя размешчана на сайце ЦВК, паведамляе БелТА.**

У Брэсцкай вобласці створана 911 участкаў, у Віцебскай — 768, у Гомельскай — 1009. У Гродзенскай вобласці іх утворана 669, у Мінскай — 982, у Магілёўскай — 739, у Мінску — 707. За мяжой беларусы змогуць прагаласаваць на 46 участках.

Па звестках ЦВК, з больш чым 5,8 тысячы ўчасткаў для галасавання 234 будуць працаваць у санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, у вайсковых часцях — 17.

Нагадаем, выбары ў Палату прадстаўнікоў прызначаныя на 17 лістапада, у Савет Рэспублікі — на 7 лістапада.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Для развіцця тэрыторый



Патэнцыял, які валодаюць Саветы дэпутатаў, можа выкарыстоўвацца больш эфектыўна. стар. 2

### 18 мільёнаў еўра



Такі планаваны аб'ём фінансавання па праграме ЕС, якая рыхтуецца ў галіне рэгіянальнага развіцця і падтрымкі мясцовых ініцыятыў у Беларусі. стар. 2

### На прынцыпах добрасумленнасці



Распрацоўшчыкі — пра новы Падатковы кодэкс. стар. 4

### Горад са смакам кавы



У Гродне амаль кожны тыдзень адкрываюцца бары і кавярні, але іх усё роўна не хапае. стар. 15

### Смачна і карысна



Плошчы пладова-ягадных насаджэнняў у Брэсцкай вобласці плануюць абнавіць і пашырыць. стар. 16

ВЫБАРЫ-2019

## Хто стане сенатарам?

**На Міншчыне ідзе вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі.**

У Мінскай вобласці праходзяць сумесныя пасяджэнні прэзідыумаў раённых і гарадскога Саветаў дэпутатаў і выканаўчых камітэтаў па вылучэнні кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі сёмага склікання.

Сумесныя пасяджэнні адбыліся ў дзевяці раёнах вобласці. У ліку тых, хто ў будучыні зможа прадстаўляць інтарэсы рэгіёна ў верхняй палаце парламента, начальнік галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінаблвыканкама Аляксандр Бачыла, дырэктар сярэдняй школы № 4 горада Маладзечна Каліна Капуцкая, старшыня Барысаўскага раённага аб'яднання арганізацый прафсаюза Алена Зяблікава.

Учора, 19 верасня, пасяджэнні прайшлі яшчэ ў трох раёнах: Валожынскім, Нясвіжскім і Стаўбцоўскім. 20 верасня яны адбудуцца ў Клецкім, Капыльскім, Салігорскім. У Любані, Старых Дарогах, Слуцку, Дзяржынску, Смалявічах, Пухавічах і Уздзе вылучэнне кандыдатаў адбудзецца 24 верасня, у Мінскім раёне — на дзень раней.

Адпаведна з заканадаўствам, Мінскую вобласць у Савеце Рэспублікі павінны прадстаўляць восем сенатараў. Членаў верхняй палаты парламента выберуць на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў базавага ўзроўню вобласці.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## Участкі пераехалі на першы паверх

**Зразумела, не ўсе. Але ж значна больш, чым было ў мінулую выбарчую кампанію.**

Начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай работы Гомельскага гарвыканкама Таццяна Марчанка расказала, што пры падрыхтоўцы да сёлетніх выбараў вырашаны пытанні па пераносе памяшканняў участкаў для галасавання з другога паверха на першы ў пяці установах адукацыі. Цяпер на другім паверсе размешчана 36 такіх памяшканняў, а ў 2016 годзе іх было 56.

Дарэчы, патрабаванням безбар'ернага асяроддзя ў Гомелі ў той ці іншай меры адпавядаюць 67 % (139 з 208) участкаў для галасавання. У мінулую выбарчую кампанію — толькі 41 %. Пра гэта ішла размова на пасяджэнні Гомельскай абласной выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання.

Напрыклад, створана безбар'ернае асяроддзе ў СШ № 72 абласнога цэнтра, дзе размешчаны чатыры ўчасткі для галасавання: ёсць пандусы, поручні, магчымасць перасоўвання ўнутры будынка.

У дзень асноўнага галасавання 1209 паўналетніх інвалідаў-спінальнікаў, якія жывуць у Гомелі, змогуць скарыстацца магчымасцю аддаць свой голас за кандыдата як па месцы жыхарства, так і непасрэдна на ўчастку. Спісы будуць перададзены ва ўчастковыя камісіі, члены якіх удакладняць месца, дзе людзі з абмежаванымі магчымасцямі хочуць прагаласаваць.

Таксама валанцёры будуць аказваць дапамогу ўсім, каму яна патрабуецца, — у тым ліку і сталым. На некаторых участках плануюць устанавіць часовыя прыстасаванні для безбар'ернага доступу інвалідных калясак. Паўсюдна будуць трафарэты і лупы для выбаршчыкаў, якія маюць дрэнны зрок ці не бачаць узусім.

**Старшыня абласной выбарчай камісіі Аляксей НЯВЕРАЎ** падкрэсліў важнасць стварэння ўмоў на ўчастках для галасавання людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ТЭРЫТОРЫЙ

### Патэнцыял, якім валодаюць Саветы дэпутатаў, недастаткова запатрабаваны і можа выкарыстоўвацца больш эфектыўна

**Такую думку выказаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мясніковіч, які на мінулым тыдні наведаў з рабочым візітам Бялыніцкі раён.**

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента, старшыня Савета Рэспублікі азнаёміўся з вопытам работы Машчаніцкага сельскага Савета дэпутатаў, наведаў аграгарадок Вішоў, правёў сустрэчу з прадстаўнікамі дэпутацкага корпуса, падчас якой былі разгледжаны віднікі работы Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню Магілёўскай вобласці па рашэнні пытанняў устойлівага развіцця тэрыторый і павышэнні якасці жыцця насельніцтва.

— У Савеце Рэспублікі мы пастаянна абмяркоўваем пытанні мясцовага кіравання і самакіравання і лічым, што патэнцыял, якім валодаюць сельскія, раённыя, гарадскія Саветы дэпутатаў, недастаткова запатрабаваны і можа выкарыстоўвацца больш эфектыўна, — адзначыў старшыня Савета Рэспублікі.

Ён звярнуў увагу на тую акалічнасць, што многія з дэпутатаў — вельмі актыўныя, не абыякавыя да праблем насельніцтва людзі. «Хацелася б, каб іх імкненні быць карыснымі рэалізоўваліся, — выказаў пажаданне ён. — Трэба ўлічваць і тое, што патэнцыял сельсаветаў, тых гаспадарак і арганізацый, якія знаходзяцца на іх тэрыторыі, — гэта ўсё фарміруе ВУП, які да канца 2025 года павінен вырасці ў 1,8 раза. А гэта жыццёвы ўзровень людзей».

Старшыня Машчаніцкага сельскага Савета дэпутатаў Іна Напрэенка паведаміла, як у сельсавеце пабудавана ўзаемадзеянне паміж органамі самакіравання, дэпутацкім корпусам і органамі ўлады.



Фота БелТА.

Дарэчы, Машчаніцкі сельсавет складаецца з двух аб'яднаных Саветаў. Адміністрацыйным цэнтрам яго з'яўляецца аграгарадок Машчаніца. На тэрыторыі сельсавета размяшчаюцца 40 населеных пунктаў, колькасць насельніцтва — 1855 чалавек.

Старшыня мясцовага сельсавета звярнула ўвагу на формы работы дэпутатаў і старастаў вёсак з людзьмі — у прыватнасці, на пастаянную практыку правядзення сельскіх сходаў, дзён інфармавання, асабістых прыёмаў, дзён вёскі, аказанне дапамогі пажылым людзям, вывучэнне пытанняў, якія хвалююць насельніцтва, што дазваляе своечасова вырашаць многія праблемы.

Міхаіл Мясніковіч звярнуў увагу на ролю ў гэтым старастаў вёсак. «Гэта сапраўды людзі, якія па закліку сэрца займаюцца на грамадскіх пачатках такой важнай работай, ідуць у праблемныя сем'і, дапамагаюць пажылым людзям, дзецям. Яны карыстаюцца аўтарытэтам у насельніцтва. Старасты, дэпутаты сельсаветаў — гэта важная катэгорыя, якая працуе на забеспячэнне належнага ўзроўню жыцця нашага насельніцтва», — дадаў ён.

Праблемы вёсак і павышэнне якасці жыцця сельскага насельніцтва на сустрэчы абмяркоўваліся ўсебакова. Так, старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр Папкоў закрануў тэму падтрымкі даходнасці сем'яў за кошт асабістых прысядзібных участкаў.

— Неабходна стварыць умовы, каб прысядзібныя ўчасткі працавалі на даход сям'і: дзесьці неабходна дапамагчы насеннем, дзесьці — у апрацоўцы і гэтак далей, але галоўнае — арганізаваць закупкі. Мы павінны думаць, як фарміраваць даходнасць насельніцтва, — падкрэсліў ён.

У аграгарадку Вішоў старшыня Савета Рэспублікі пагутарыў з яго жыхарамі, адказаў на пытанні, што цікавяць людзей. У прыватнасці, гаворка ішла пра перспектывы развіцця эканомікі Бялыніцкага раёна, занятасць, стварэнне новых працоўных месцаў. Прагучалі пытанні, якія датычыліся фармацэўтычнага рынку краіны, яго асартыменту і цэн на лекі. Жыхары аграгарадка таксама цікавіліся, ці будзе ўдасканальвацца сістэма падтрымкі таленавітай моладзі.

Спікер Савета Рэспублікі таксама наведаў алею славы і міру СВК «Калгас «Радзіма», дзе прыняў удзел у пасадцы дрэва.

# НАДАЦЬ НОВЫ ІМПУЛЬС

### 18 мільёнаў еўра — такі планаваны аб'ём фінансавання па праграме ЕС, якая рыхтуецца ў галіне рэгіянальнага развіцця і падтрымкі мясцовых ініцыятыў у Беларусі

**У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова з кіраўніком аддзела праграм супрацоўніцтва Прадстаўніцтва ЕС у Рэспубліцы Беларусь Берандам дэ Гроатам. У сустрэчы прыняў удзел таксама старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў.**



Фота БелТА.

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента, Беранд дэ Гроат расказаў аб новай праграме ЕС для Беларусі ў галіне рэгіянальнага развіцця і падтрымкі мясцовых ініцыятыў, якая рыхтуецца сумесна з Міністэрствам эканомікі Рэспублікі Беларусь. Дакумент накіраваны на садзейнічанне комплекснаму развіццю рэгіёнаў за кошт выкарыстання іх канкурэнтных пераваг. Ён уключае тры асноўныя кампаненты — навучанне мясцовых органаў улады і органаў самакіравання новым практыкам эканамічнага развіцця, у тым ліку фарміраванню стратэгій рэгіянальнага развіцця, вызначэнне «пунктаў росту» ў рэгіёнах, а таксама фінансаванне праектаў па іх развіцці. Плануецца, што праграма будзе запушчана налета і ахопіць Гомельскую, Магілёўскую і Віцебскую вобласці. Аб'ём фінансавання ацэньваецца больш чым у 18 мільёнаў еўра.

Беранд дэ Гроат падкрэсліў, што супрацоўніцтва ЕС з Беларуссю развіваецца па многіх кірунках — энергетыка і энергаэфектыўнасць, ахова навакольнага асяроддзя, адукацыя, ахова здароўя і іншыя. «У цэлым гэтае супрацоўніцтва ацэньваецца як эфектыўнае з пункту гледжання тых задач, якія ставіліся ў межах праграм. Але я хацеў бы падкрэсліць, і мы гэта абмяркоўваем з Міністэрствам эканомікі Беларусі: прыйшоў час выходзіць на больш высокі ўзровень узаемадзеяння ў сферы эканамічнага развіцця. Менавіта ў гэтым кантэксце мы распрацоўваем новую праграму», — заявіў ён.

У сваю чаргу, Аляксандр Папкоў адзначыў, што Беларусь разлічвае на сумесную работу, якая прынесла б практычны вынік і дапамагла б у вырашэнні многіх рэгіянальных пытанняў. «У цэнтры ўвагі нашай рэгіянальнай палітыкі — чалавек. Таму калі мы кажам аб устойлівым развіцці тэрыторый, гаворка ідзе пра экалогію, вырашэнне сацыяльных пытанняў, эканоміку. А гэта даходнасць насельніцтва, узровень і якасць медыцынскага абслугоўвання, адукацыя і гэтак далей», — сказаў ён.

Старшыня Пастаяннай камісіі прапанаваў пры падрыхтоўцы праграм ЕС каардынаваць дзеянні для забеспячэння эфектыўнага асваення грантаў. «Пры гэтым задачы, якія ставяцца, павінны быць зразумелыя, ясныя, адпрацаваныя. Мы павінны вызначыць кірункі дзейнасці, «пункты росту» для канкрэтных тэрыторый, — сказаў ён. — Магчыма, мы зробім гэта на базе аднаго раёна і пакажам як прыклад — што трэба рабіць, каб аднавіць эканамічны патэнцыял». Асаблівае значэнне пры гэтым неабходна надаць развіццю прадпрымальніцтва, дадаў Аляксандр Папкоў.

Ён нагадаў, што па даручэнні кіраўніка дзяржавы ў Беларусі рыхтуецца канцэпцыя развіцця мясцовага самакіравання. «У аснову мы закладваем Еўрапейскую хартыю мясцовага самакіравання, але з улікам нашых асаблівасцяў. З гэтай мэтай цяпер вывучаем практыку Францыі, Германіі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Польшчы», — праінфармаваў ён. Развіваецца супрацоўніцтва па гэтых пытаннях з Кангрэсам мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы.

# Багатыя прадпрыемствы — квітнеючая краіна

## Пачуць зваротны бок

— Адбылася сур'ёзная трансфармацыя Падатковага кодэксу, і мы жадаем пачуць меркаванні практыкаў, якія карыстаюцца новымі нормамі і палажэннямі, — падкрэсліў падчас візіту ў Магілёў **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ,** які ўзначальвае прэзідыум навукова-кансультатыўнага савета. — Нас цікавіць, як жывуць эканамічныя службы, ці была спрошчана сістэма падаткаабкладання. Адна з галоўных задач новага Падатковага кодэкса — зрабіць больш нормаў прамога ўздзеяння і менш адсылачных нормаў, каб было прасцей працаваць і эканамічным службам прадпрыемстваў, і тым, хто правярае паўнату выплаты падаткаў. Мы ў Савеце Рэспублікі не ставім пад сумнеў тыя рашэнні, якія прыняты ў рамках кодэксу, але ўдасканаленне — працэс пастаянны. Без уліку думкі тых, для каго гэта ўсё робіцца, складана казаць пра трапленне ў дзясятку. Безумоўна, вывучэнне спраў на месцах, размова з людзьмі, вучонымі, практыкамі — карысная справа. Былі асцярогі наконт прыняцця кодэкса ў 2018 годзе, гучалі прапановы не спяшацца і крыху яго дапрацаваць. На завяршальным этапе былі створаны тры рабочыя групы, адну з якіх узначальваў я. Былі пэўныя спрэчкі, але ў рэшце рэшт мы прынялі рашэнне выходзіць на разгляд парламентам той рэдакцыі, якая была падрыхтавана папярэднімі рабочымі групамі, з некаторымі змяненнямі і дапаўненнямі. Такім чынам новы кодэкс быў разгледжаны, прыняты і падтрыманы Прэзідэнтам. Прайшоў пэўны перыяд, і мы праводзім маніторынг, глядзім, як працуюць ключавыя законы, ці трэба ўносіць прапановы па змяненнях і дапаўненнях.

У рабоце навукова-кансультатыўнага савета прыняў удзел **міністр па падатках і зборах Сяргей НАЛІВАЙКА.** Ён запэўніў, што сёння ў краіне робіцца ўсё для таго, каб падатковыя органы працавалі на новым высокатэхналагічным узроўні і рабілі працэс збірання падаткаў максімальна простым і мабільным.

— Нам цікава пачуць ад прадстаўнікоў бізнесу, што, на іх погляд, трэба падшліфаваць, удасканаліць, — адзначыў ён. — Мы бачым пэўныя моманты, але яны зусім не катэгарычныя, не ўплываюць на канцэптуальныя асновы Кодэкса. Гэта больш тэхнічная работа. Апошнія гады Міністэрства па падатках і зборах праводзіць адкрытасць і празрыстасць. Мы гатовы да дыялогу, каб скарэктаваць нейкія вузкія моманты. Недахопы і няўвязкі выклікаюць непаразуменне, а хацелася б, каб усё правільна трактавалася і разумелася. Размова за круглым сталом з прадстаўнікамі бізнесу, кіраўнікамі прадпрыемстваў вельмі для нас важная. Нам цікава і канструктыўная крытыка. Такія мерапрыемствы дазваляюць дакапацца да ісціны і зрабіць лепшымі тыя нормы, якія сёння, магчыма, не ідэальныя.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

## Бліжэй да кліента

Цэнтр абслугоўвання плацельшчыкаў інспекцый Міністэрства па падатках і зборах па Ленінскім і Магілёўскім раёнах прапісаўся па адным адрасе — вуліца Касманаўтаў, 19А. Гэта адзін з самых вялікіх цэнтраў у Беларусі. Напрыклад, у інспекцыі па Ленінскім раёне адных толькі індывідуальных прадпрымальнікаў абслугоўваецца болей чым шэсць тысяч, а фізічных асоб — амаль 40 з паловай тысяч чалавек. І ўмовы, якія створаны для работы з такой колькасцю людзей, уражваюць. На першым паверсе знаходзіцца нават куточак для дзяцей з карыснымі кніжкамі-казкамі пра падатковыя ўзаемаадносіны. У калідорах і цяпер няшмат кліентаў, а кіраўніцтва інспекцый услых марыць пра час, калі ўсе працэдуры можна будзе выконваць дыстанцыйна. Пры жаданні можна пачынаць ужо з сённяшняга дня. Тэхніка, як той кажаў, дазваляе. На сайце інспекцый можна знайсці разнастайныя электронныя сэрвісы як для фізічных асоб, так і для арганізацый, прадпрыемстваў і індывідуальных прадпрымальнікаў. А лепш стварыць асабісты кабінет, праз які можна вырашыць усе «падатковыя пытанні» — напрыклад, падаць дэкларацыю і заплаціць падаткі з дому. Дарэчы, праз асабісты кабінет можна паведаміць падатковікам, што вы самазаняты, і з дапамогай М-банкінгу аплаціць падатак. І прыходзіць для ўсяго гэтага ў цэнтр абслугоўвання ў такім выпадку не трэба.

Што датычыцца цэнтра, то абслугоўванне тут пабудавана так, каб кліент як мага менш часу праводзіў у чаканні. Адміністратар Анастасія Пратасава расказвае, чым можа дапамагчы кліенту. У яе абавязкі ўваходзіць сарыентаваць плацельшчыка, паказаць узоры, растлумачыць, як карыстацца тэрміналам.

— У месяц мы прадстаўляем прыблізна 2,5 тысячы паслуг. У пікавы час, калі ідзе падача дэкларацый, чаканне ў чарзе складае тры хвіліны і шэсць-сем хвілін кліент абслугоўваецца. Сёння мы распрацоўваем вялікую колькасць рэгламентаў, стандартызуем паслугі. Па кожнай з іх існуе рэгламент, дзе выразна прапісаны час, які павінен патраціць работнік падатковага органа на абслугоўванне плацельшчыка, і працэдуры, якія трэба здзейсніць. Плацельшчыкі пры жаданні можа ацаніць работу і выставіць сваю адзнаку. Усе гэтыя аналітычныя матэрыялы мы акумулюем, для таго каб вырашыць, як потым пэўныя працэдуры ўдасканальваць, — запэўнівае кіраўніцтва падатковай інспекцыі.





Фота БелТА.

## Ёсць заўвагі

Аграхолдынг «Сервалюкс» — найбуйнейшы ў краіне вытворца мяса птушкі. Калі казаць мовай лічбаў — гэта 10 тысяч рабочых месцаў, 500 мільёнаў долараў выручкі штогод, 170 мільёнаў долараў экспарту, 17,2 мільёна рублёў падаткаў толькі за першае паўгоддзе.

— Кіравацъ такой складанай структурай можна, калі ёсць празрыстасць, — заўважае кіраўніцтва холдынга. — Каб забяспечыць яе і мець магчымасць размаўляць на адной мове з інвестарамі, такімі як Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця, яшчэ ў 2012 годзе мы прынялі рашэнне, што будзем фарміраваць справаздачнасць не толькі па нацыянальных стандартах, але і па міжнародных. Сёння створана спецыяльнае падраздзяленне, і мы штоквартальна робім такую справаздачнасць. Мы імкнёмся наблізіць улік па нацыянальных стандартах да ўліку па міжнародных. Вялікая ўвага аддаецца падатковаму ўліку. Мы сельгасвытворцы, і большасць нашых юрыдычных асоб знаходзіцца на адзіным падатку, але ёсць і такія юрыдычныя асобы, якія не з'яўляюцца сельгасвытворцамі і плацяць падатак на прыбытак. Са станоўчых момантаў новага Падатковага кодэкса можна адзначыць магчымасць большага падатковага інвестыцыйнага выліку і магчымасць выкарыстоўваць паніжаную падатковую стаўку, калі прыбытак на працягу 3-5 гадоў не размяркоўваўся, і, адпаведна, паменшыць падаходны падатак фізічнай асобы. Гэта, як мы лічым, вялікі рух наперад. Яшчэ адзін плюс у тым, што апошнім часам падатковыя органы робяць акцэнт на камеральнасць праверак — гэта аднімае менш часу і ў падатковых органаў, і ў нас.

Для нас засталіся праблемнымі пытанні транспартнага цэнаўтварэння, вызначэння рыначнага дыяпазону цэн, рыначнага дыяпазону рэнтабельнасці. Мы сёння жадаем абгрунтаваць асабісты рынкавы дыяпазон цэн або рэнтабельнасці, але нам не хапае інфармацыі. Калі звярнуцца да вопыту Расіі, то там ёсць магчымасць карыстацца сістэмай СПАРК, іншымі рэсурсамі. Вельмі хацелася б, каб суб'екты гаспадарання маглі выкарыстоўваць адну і тую ж крыніцу інфармацыі з падатковымі органамі. Мы трапляем у абмежаваны дыяпазон цэн, і гэта для нас зона рызыкі.

Яшчэ адзін буйны падаткаплацельшчык у абласным цэнтры — ААТ «Магілёўліфтмаш». Менавіта на яго базе прайшло пашыранае пасяджэнне навукова-кансультатыўнага савета. Падчас свайго даклада **намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях Сяргей ЧАРТКОЎ** адзначыў як адзін з плюсоў новага кодэкса тое, што за кошт адмены павышальных каэфіцыентаў да ставак падатку на нерухомасць, зямельнага падатку па аб'ектах звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва прадпрыемства сэканоміла 77 тысяч рублёў. Але нароўні са станоўчымі нормамі і палажэннямі, якія прапісаны ў новым кодэксе, застаюцца і пытанні. Адна з праблем, якую агучыў Сяргей Валер'евіч, датычыцца затрат на вытворчасць асноўнай і інавацыйнай прадукцыі.

— Згодна з дзеючым падатковым заканадаўствам, для выкарыстання льготы па падатку на прыбытак і рэалізацыю інавацыйных тавараў трэба весці паасобны ўлік затрат на вытворчасць і рэалізацыю такіх тавараў, — адзначыў ён. — Аднак на нашым прадпрыемстве гэта немагчыма, таму што інавацыйная і асноўная прадукцыя выпрацоўваецца на адных і тых жа вытворчых плошчах, адным і тым жа абсталяванні, адны́мі і тымі ж работнікамі. Гэта не дазваляе вызначыць непасрэдныя затраты, звязаныя з вытворчасцю інавацыйнай прадукцыяй. Паколькі ў нас няма магчымасці для паасобнага вядзення затрат, мы прапануем прадугледзець магчымасць вызначэння затрат на вытворчасць і рэалізацыю інавацыйнай прадукцыі метадам вызначэння ўдзельнай вагі выручкі ад рэалізацыі інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме выручкі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

### • Кампетэнтна

**Эла СЯЛІЦКАЯ, намеснік міністра па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь:**

— Гэты працэс пастаянна патрабуе ўдасканалення, і мы адсочваем, на што непасрэдна трэба звярнуць увагу. Сумесна з парламентарыямі, бізнес-суполкай, кіраўнікамі прадпрыемстваў, зацікаўленымі дзяржаўнымі ведамствамі глядзім, як на практыцы працуе Падатковы кодэкс. Бо, як кажа кіраўнік дзяржавы, адна справа прыняць заканадаўчы акт, другая — адналькава выкарыстоўваць яго на практыцы. Гэта асноўны пасыл. Мы прыехалі ў Магілёў, каб пачуць водгукі прадпрыемстваў, разабрацца, якія праблемы існуюць у дачыненні да таго, каб прыняць аператыўныя меры па растлумачэнні падатковага заканадаўства. У пачатку года, калі быў адаптацыйны перыяд, мы праехалі ўсе вобласці і горад Мінск, наведалі ўсе міністэрствы, ведамствы, канцэрны, вучэбныя цэнтры Мінфіна, Мінэканомікі, Мінпрама, правялі тлумачальную работу, каб бухгалтарская суполка ведала, як яго прымяняць. Сёння задача другога этапу — зразумець, што ўжо ёсць на практыцы і што аператыўна можна выправіць. Мы жадаем ведаць, як працуе кодэкс, якія ёсць цяжкасці.

КАМПЕТЭНТНА

# НА ПРЫНЦЫПАХ ДОБРАСУМЛЕННАСЦІ

## Распрацоўшчыкі — пра новы Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь

**ЛЕТАСЬ Падатковы кодэкс Беларусі зазнаў істотныя змяненні. Падчас пасяджэння пашыранага навукова-кансультатыўнага савета па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, якое прайшло ў Магілёве, быў зроблены аналіз таго, як працуюць новыя нормы і палажэнні і што трэба яшчэ зрабіць, каб удасканаліць дакумент. З асноўным дакладам па гэтым пытанні выступіла намеснік міністра па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь Эла СЯЛІЦКАЯ.**



### Каб было проста і зразумела

Намеснік міністра нагадала, што новая рэдакцыя Падатковага кодэксу была зроблена па даручэнні кіраўніка дзяржавы.

— Перад рабочай групай сталі тры задачы: па-першае — забяспечыць прастату і зразумеласць нормаў і лёгкасць іх успрымання, па-другое — рэалізаваць у адпаведнасці з Дэкрэтам № 7 прапановы, накіраваныя на зніжэнне падатковай нагрузкі на суб'екты гаспадарання ў сувязі з прыцягненнем інвестыцый, рэінвеставаннем прыбытку, стварэннем новых працоўных месцаў, па-трэцяе — спрасціць падатковае адміністраванне. Пры рабоце над рэдакцыяй канкрэтных глаў, у першую чаргу тых, якія вызначаюць парадак аплаты падаткаў фізічнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, малым бізнесам, — стараліся зрабіць іх максімальна простымі для ўспрымання. Для забеспячэння нормаў прамога дзеяння ў кодэкс уключаны нормы больш чым двух дзясяткаў указаў кіраўніка дзяржавы. Вядома, пазбегнуць усіх спасылак у кодэксе не атрымалася. Бо ён апелюе паняццямі, якія выкарыстоўваюцца ў сумежных галінах права, і дубляваць іх не мае сэнсу.

У сваім дакладзе Эла Сяліцкая зрабіла аналіз таго, як дзейнічаюць новыя нормы. З першага студзеня па падатку на прыбытак у 1,5 раза павялічыўся памер інвестыцыйнага выліку. Так, па выніках першага паўгоддзя інвестылікам скарысталіся 1290 плацельшчыкаў на агульную суму 605 мільёнаў рублёў. Для параўнання, за ўвесь мінулы год сума інвестыліку склала 439 мільёнаў рублёў. У кодэксе таксама ўстаноўлены льготныя стаўкі па падатку на прыбытак і падаходным падатку ў дачыненні да дывідэндаў. У прыватнасці, калі ўласнікі прымаюць рашэнне аб неразмеркаванні дывідэндаў і накіроўваюць атрыманы прыбытак на развіццё прадпрыемства, то стаўкі падаткаў зніжаюцца з 12 % да 6 %, калі прыбытак не размяркоўваўся на працягу трох гадоў, і да 0 %, калі прыбытак не размяркоўваўся пяць гадоў. З 1 студзеня для плацельшчыкаў, якія працуюць па спрошчанай сістэме падаткаабкладання, павялічаны крытэрыі па выручцы. Для арганізацый такі крытэрый павялічаны да 1 мільёна 950 тысяч беларускіх рублёў, а для індывідуальных прадпрымальнікаў да 420 тысяч беларускіх рублёў. Змяненне спрыяла росту суб'ектаў малога бізнесу: за паўгода іх стала болей на 20,5 тысячы. Для параўнання, за ўвесь 2018 год прырост склаў толькі каля 10,5 тысячы. На 1 ліпеня колькасць плацельшчыкаў па спрошчанай сістэме падаткаабкладання дасягнула 53,6 % ад агульнай колькасці суб'ектаў гаспадарання, якія стаяць на ўліку ў падатковых органах.

З гэтага года ўладальнікі новых (пабудаваных пачынаючы з 1 студзеня) аб'ектаў нерухомасці і зямельных участкаў, на якіх яны знаходзяцца, вызваляюцца ад падатку на працягу першага года з дня прыёмкі ў эксплуатацыю, а потым яшчэ на працягу чатырох наступных гадоў карыстаюцца паніжанымі стаўкамі. Пры гэтым у дачыненні да такіх аб'ектаў і зямельных участкаў мясцовыя Саветы дэпутатаў не маюць права павялічваць стаўкі маёмасных падаткаў. Гэтай прэферэнцыяй, адзначыла дакладчык, скарыстаўся ўжо 431 плацельшчык. Сума падаткаў, якія засталіся ў іх распараджэнні, склала 24,2 мільёна рублёў.

> «Па выніках першага паўгоддзя інвестылікам скарысталіся 1290 плацельшчыкаў на агульную суму 605 мільёнаў рублёў. Для параўнання, за ўвесь мінулы год сума інвестыліку склала 439 мільёнаў рублёў.

### Дыстанцыйны кантроль

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 414 «Аб удасканаленні безнаяўных разлікаў», які быў прыняты летась, з 1 студзеня 2020 года прадугледжана ўкараненне аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы выканання грашовых абавязацельстваў.

— Працаваць з гэтым праграмным прадуктам будзе міжбанкаўскі разліковы цэнтр Нацыянальнага банка, — кажа Эла Сяліцкая. — У гэтай інфармацыйнай базе будзе не толькі акумулявацца інфармацыя па грашовых сродках усіх рахункаў суб'ектаў гаспадарання — сюды кантралюючыя органы будуць накіроўваць усе свае плацежныя патрабаванні для спагнання запазычанасці ў выразнай чарговасці. Укараненне гэтага механізма, на наш погляд, дазволіць цалкам вырашыць усе праблемныя пытанні, якія былі звязаны з прымусовым спагнаннем. Раней былі выпадкі, калі плацельшчыкі сігналізавалі пра падвойванне, а то і патройванне спагнання запазычанасці з рахункаў.

Развіццё лічбавых тэхналогій дазволіла падатковым органам перайсці на новыя формы кантролю. Сёння ў іх інфармацыйным асяроддзі захоўваюцца і выкарыстоўваюцца звесткі ў адносінах 430 тысяч дзеючых прадпрыемстваў і індывідуальных прадпрымальнікаў, болей чым трох мільёнаў фізічных асоб. Летась падатковыя органы апрацавалі каля чатырох мільёнаў падатковых дэкларацый. У сістэме электронных рахункаў-фактур закумулявана каля 410 мільёнаў дакументаў плацельшчыкаў. У інфармацыйныя сістэмы падатковых органаў загружаюцца звесткі, якія прыходзяць ад болей чым 50 дзяржаўных органаў, арганізацый, у тым ліку банкаў. Выкарыстанне новых тэхналогій у апрацоўцы інфармацыі дазволіла канцэптуальна змяніць падыходы, у першую чаргу ў камеральным кантролі, і перайсці ў сферу папераджальных мерапрыемстваў, тым самым знізіць адміністрацыйны ціск на добрасумленных плацельшчыкаў і ліквідаваць залішняе ўмяшанне ў дзейнасць гаспадарчых суб'ектаў. На аснове аналізу інфармацыйных баз даных, якімі валодаюць падатковыя органы, яны сёння могуць дыстанцыйна выяўляць парушэнні плацельшчыкаў. У першым паўгоддзі было накіравана 27,5 тысячы паведамленняў аб памылках або непаўнаце звестак у падатковых дэкларацыях. Амаль у 95 % выпадкаў плацельшчыкі скарысталіся падказкай, самастойна адкарэкціравалі свае падатковыя абавязацельствы і даплацілі ў бюджэт 124 мільёны беларускіх рублёў. Акрамя гэтага, механізм дазволіў за паўгоддзе паменшыць на 56 мільёнаў рублёў заяўленую да пакрыцця з бюджэту суму ПДВ (падатку на дабаўленую вартасць). Пры гэтым да суб'ектаў штрафныя санкцыі не прымяняліся.

— З гэтага года камеральны кантроль падзелены на папярэдні і далейшы, — паведаміла намеснік міністра. — На папярэднім этапе прадугледжана выкарыстанне праграмных і тэхнічных сродкаў праверкі падатковых дэкларацый. Цяпер дапрацоўваецца праграмнае забеспячэнне, якое дазволіць пры парушэннях плацельшчыкамі парадку запаўнення дэкларацый аўтаматычна выводзіць на экран камп'ютара пералік памылак. Задача наступнага этапу камеральнага кантролю — вызначэнне ступені верагоднасці заяўленай плацельшчыкам у дэкларацыі сумы падаткаў. Калі падатковы орган высветліў недакладнасць інфармацыі ў дэкларацыі, спачатку ён паведамляе аб неабходнасці ўдакладнення сумы, а калі плацельшчык гэта праігнаруе, яму накіруюць патрабаванне аб перадачы дакументаў па здзелцы, абставіны здзяйснення якой выклікаюць у падатковага органа сумнеў. Калі плацельшчык праігнаруе і гэта патрабаванне, толькі тады будзе складзены акт камеральнай праверкі.



Фота БелТА.

Значны прафілактычны эфект у рабоце з плацельшчыкам аказвае сістэма ўліку электронных рахункаў-фактур, якая дазваляе супрацоўнікам падатковых органаў, не выходзячы на праверку, вызначаць паўнату аплаты ПДВ, не дапускаць неабгрунтаванага вяртання ПДВ з бюджэту. Сумарны эфект ад правядзення камеральнага кантролю з выкарыстаннем аўтаматызаванай сістэмы ўліку электронных рахункаў-фактур склаў за мінулы год 248 мільёнаў рублёў. У першым паўгоддзі 2019-га — 105,6 мільёна рублёў.

### Падмануць не атрымаецца

З гэтага года змяніўся таксама падыход да вядзення дакументальных праверак. У адпаведнасці з Указам кіраўніка дзяржавы № 376 ад 16 кастрычніка 2017 года, план выбарачных праверак фарміруецца на аснове распрацаваных крытэрыяў ацэнкі ступені рызыкі. У інспекцыі накіраваны індыкатары нетыповых паводзін плацельшчыкаў, якія ўказваюць на высокую імавернасць здзяйснення правапарушэння. Пры гэтым колькасць праверак сёлета ў параўнанні з аналагічным перыядам 2017 года скарацілася ў 10 разоў — з 2761 да 292 на першае паўгоддзе 2019-га. Той вялікі аб'ём інфармацыі, які маюць падатковыя органы, і яе аналіз дазваляюць выходзіць на праверку суб'ектаў, здольных на падатковае правапарушэнне.

Эла Сяліцкая таксама звярнула ўвагу на артыкул 33 Падатковага кодэкса, які прыйшоў на змену Указу № 488 «Аб некаторых мерах па прадухіленні незаконнай мінімізацыі сум падатковых абавязацельстваў».

— Правапрымяняльная практыка гэтага артыкула толькі пачынаецца, — адзначыла яна. — Разумеем, што выкарыстанне гэтых нормаў патрабуе ўзважанага падыходу і ў першую чаргу тут можна кіравацца прынцыпам, які лёг у аснову падатковага заканадаўства, — прынцыпам добрасумленнасці падаткаплацельшчыка. Абвергнуць яго можна, толькі сабраўшы ўсе бясспрэчныя доказы ўхілення ад падаткаў.

Дзеля фарміравання адзіных падыходаў прымянення гэтага артыкула ўсе акты тэрытарыяльных падатковых органаў сёння ўзгадняюцца з Міністэрствам па падатках і зборах. За восем месяцаў было ўзгоднена 11 актаў.

— Мы імкнёмся вельмі дасканала прагледзець усе доказы, якія сабраў тэрытарыяльны падатковы орган і якія былі пакладзены ў акт праверкі, — запэўніла намеснік міністра.

### Час патрабуе змен

Кодэкс прыняты своечасова, падкрэсліла Эла Сяліцкая. Яна выказала вялікую ўдзячнасць усім, хто прымаў удзел у яго распрацоўцы, — бізнес-супольцы, профільным камісіям, дэпутатам. З'явілася шмат дзейных падатковых інструментаў, у першую чаргу ў падатковым адміністраванні. Але мяжы ўдасканаленню няма. Удзельнікі навукова-кансультатыўнага савета казалі пра неабходнасць далейшай карэкціроўкі Падатковага кодэкса, перагляду павышальных і паніжальных каэфіцыентаў на нерухомасць і зямлю, пра недахоп тлумачальнай інфармацыі па 33-м артыкуле, дастаткова высокія падатковыя нагрузкі. Ішла гаворка і пра тое, што трэба ўлічваць сітуацыю ў суседніх краінах. Прадстаўнікоў дзелавых колаў таксама хвалюе, што падатковая нагрузка на фоне ўдзельнікаў еўразійскага рынку ў нас самая высокая. А для канкурэнтаздольнасці на суседніх рынках падаткі павінны быць супастаўныя. Але ўсе без выключэння адзначылі безумоўны плюс у тым, што існуе зваротная сувязь паміж распрацоўшчыкамі і карыстальнікамі. Можна спадзявацца, што ўдасканаленне існуючай падатковай сістэмы — гэта толькі справа часу. Маніторынг стаў яскравым сведчаннем таго, што не зацікаўленых у гэтай справе бакоў няма.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Тэлесеткі

## КАГО ПЕСНЯ ДА «ЕЎРАБАЧАННЯ» ДАВЯДЗЕ

**Сёння ўвечары стане вядома імя прадстаўніка нашай краіны на дзіцячым «Еўрабачанні-2019», што пройдзе 24 лістапада ў польскім Глівіцы.**



Дакладней, імя прадстаўніцы. Бо каму б з дзесяці выступоўцаў фінальнага гала-канцэрта, які пакажуць у прамым эфіры каналы «Беларусь 1» і «Беларусь 24» і ў анлайн-трансляцыі сайт www.tvr.by, ні аддалі свае сімпатыі гледачы і прафесійнае журы, гэта на 100 працэнтаў будуць дзяўчаты.

Елізавета Міснікава, Анастасія Жабко, Марыя Жыліна, Ксенія Галецкая, гурт Monkey Tops, Сафія Храловіч, Сафія Рустамава, гурт «Зефір», Арына Пехцерава і Марыя Ермакова — менавіта ў такім парадку канкурсанткі выйдуць на сцэну ў студыі «600 метраў» Белтэлерадыёкампаніі. У якасці спецыяльных гасцей выступяць таксама прадстаўнікі Беларусі на дзіцячым «Еўрабачанні» ў розны час: адкрывальніца гэтай гісторыі Вольга Сацюк, Аляксандр Мінёнак, Хелена Мерааі і Даніэль Ястрэмскі.

Пераможца нацыянальнага адбору па традыцыі атрымае не толькі пуцёўку на міжнародны творчы форум, але і спецыяльную ўзнагароду — «еўравізійнае» сэрца, вырабленае на шклозаводзе «Нёман». Прызавая статуэтка, сабраная з асобных каляровых частак на крышталёвую падстаўку, важыць амаль тры кіло і вырабляецца ўручную. Астатніх фіналістаў, зрэшты, таксама чакаюць падарункі — дыпломы, салодкія сюрпрызы і сертыфікаты ад партнёраў конкурсу.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## КАЗКА НА ЎСЕ ЧАСЫ




Легендарная казка Антуана дэ Сэнт-Экзюперы «Маленькі прынц» у перакладзе на беларускую мову Ніны Мацяш упершыню ўбачыла свет 30 гадоў таму — у 1989-м. Але з таго часу паэтка нястомна дапрацоўвала і рэдагавала свой пераклад. І вось упершыню сёлета тэкст з праўкамі і дапаўненнямі Ніны Язэпаўны надрукавала айчыннае выдавецтва «Папуры».

«Маленькі прынц» — самая вядомая ў свеце кніга пасля Бібліі і Карана, — адзначаюць у выдавецтве, — яна перакладзена на 300 моў свету, у тым ліку вельмі рэдкія. Гэта адна з тых нямногіх кніг, якія можна чытаць у розным узросце і штораз адкрываць для сябе новыя сэнсы. Пераклад Ніны Мацяш на беларускую мову выдатна перадае ўсе нюансы гэтага цудоўнага тэксту».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 77

Сённяшнюю задачу ***(гл. дыяграму)*** склаў для нашых чытачоў Міхаіл Кошаль з Мінска.




**Белыя:** Kpd8, Фg1, Лd5, Лf8, Cb8, Cd3, Kf7, пb4 (8).

**Чорныя:** Kpe6, Ле4, Cf6, Kb2, пп. c6, e7 (6).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі (газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013,) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Уладзіслаў Кавалёў выйграў турнір у італьянскім горадзе Спілімберга (120 удзельнікаў). Андрэй Жыгалка заняў 27-е месца са 191 на адкрытым Кубку Еўразіі ў Екацерынбургу, Аляксей Аляксандраў — 22-е са 151 у Абу-Дабі. У польскіх Сувалках (97 удзельнікаў) Юрый Ціханаў фінішаваў на 19-м месцы, Кірыл Ступак — на 21-м. Уладзіслаў Каташук выйграў турнір «С» (40 удзельнікаў) шахматнага фестывалю Рыжскага радыётэхнічнага ўніверсітэта. На Мемарыяле Карчнога ў Пецярбургу (300 гульцоў) Кірыл Ступак фінішаваў шостым, а ў хуткіх шахматах (335 удзельнікаў) падзяліў 1-4 месцы (па дадатковых паказчыках — другі). У амерыканскім Грынсбары (88 гульцоў) Сяргей Азараў падзяліў 1-9 месцы (па дадатковых паказчыках ён першы). Мікіта Маёраў быў пяты ў Славакіі (40 удзельнікаў). Валерый Казакоўскі выйграў турнір у Пецярбургу, але ў далейшым гэты малады беларускі шахматыст будзе выступаць ужо за шахматную федэрацыю Літвы.

У Кітаі прайшлі чэмпіянаты свету сярод хлопчыкаў і дзяўчынак да 8, 10 і 12 гадоў. З шасці беларусаў ніхто не стаў прызёрам, а найлепшы вынік у Міхея Навуменкі — 14-е месца.

Шмат моцных беларускіх шахматыстаў прынялі ўдзел у бліцмарафоне да Дня шахцёра ў Салігорску — прызавую тройку тут склалі гросмайстры Сяргей Жыгалка, Уладзіслаў Кавалёў і Віталь Цецераў. Першынство краіны сярод інвалідаў выйграў Дзмітрый Гранкоўскі.

* * *

Пазнаёмім чытачоў з дзвюма перамогамі беларускіх гросмайстраў у сёлетніх турнірах.

Сяргей Грышчанка — Аляксей Фёдараў (Орша, 2019). 1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. Kc3 Cg7 4. e4 d6 5. Ce2 0-0 6. Ce3 c6 7. h4 e5 8. h5 Фa5 9. hg fg 10. Лh4 g5 11. Лh1 K:e4 12. Cd3 Cf5 13. C:e4 C:e4 14. Фg4 Cf5 15. Ф:g5 Ka6 16. Ke2 Kb4 17. Kg3 ed 18. Kh5 Kc2+ 19. Kpe2 Лf7 20. Ke4 Фe5 21. Kef6+ Kph8 22. g4 C:f6 23.K:f6 Ф:f6 24.gf Ф:g5 25.C:g5 K:a1 26.f6 Kc2 27.a3 Ле8+ 28.Kpd2 d3, 0:1.

Ахмад Бімієў — Кірыл Ступак (Сочы, 2019). 1. c4 g6 2. g3 Cg7 3. Cg2 e6 4. Kc3 Ke7 5. d4 d5 6. Kf3 0-0 7. cd ed 8. 0-0 Kbc6 9. a3 Cg4 10. e3 Фd7 11. b4 Фf5 12. Kh4 Фe6 13. f3 Ch3 14. f4 C:g2 15. Kp:g2 Cf6 16. Kf3 Kf5 17. Ke5 C:e5 18. fe f6 19. g4 Kfe7 20. ef Л:f6 21. Л:f6 Ф:f6 22. Фf3 Фe6 23. Cd2 Лf8 24. Фg3 Kc8 25. Лf1 Л:f1 26. Kp:f1 Kd6 27. Фf3 Ke7 28. Kpe2 Ke4 29. b5 a6 30. a4 ab 31. ab Kc8 32. Ka4 Фd7 33. Kc5 Ф:b5+ 34. Kpd1 Kcd6 35. Ce1 Kc4 36. K:e4 Фb1+ 37. Kpe2 Ф:e4 38. Фg3 Фe7 39. Фg2 Ф:e3+, 0:1.

* * *

На працягу гэтага года праводзіцца XX Міжнародны конкурс складальнікаў задач газеты «Вячэрні Санкт-Пецярбург» у чатырох раздзелах: двухходовыя задачы, суддзя — Ю.Сушкоў; трохходовыя задачы, суддзя — Я. Расамаха; шматходовыя задачы, суддзя — П. Забірохін; эцюды. У кожны раздзел можна дасылаць па дзве кампазіцыі на e-mail: kuk.spb@mail.ru. Вынікі конкурсу будуць падведзены ў пачатку 2020 года і апублікаваны ў газеце «Вячэрні Санкт-Пецярбург», а таксама разасланыя ўсім удзельнікам па электроннай пошце. Да ўдзелу запрашаюцца і беларускія складальнікі.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.Фе8! Першымі правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

## ТРЫ НАГОДЫ ЎКЛЮЧЫЦЬ ТЭЛЕВІЗАР

### Маркетынг знутры




Гэтай восенню папулярная «народная праграма» «Беларуская часінка», якая выходзіць на канале «Беларусь 1» кожны тыдзень з панядзелка да чацвярга, адкрыла новую рубрыку — «Хітры маркетынг». Аўтар і вядучая Наталля Белагрудава выступае ў ролі «таемнага пакупніка», каб дапамагчы гледачам не трапіць у маркетынгавыя пасткі і рабіць толькі патрэбныя пакупкі.

Ужо ў першым выпуску рубрыкі эксперты патлумачылі на пальцах, чаму невялікі прадуктовы кошык лепшы (з пункту гледжання эканоміі) за ўмяшчальны вазок. Надалей нам абяцаюць інфармацыйныя «прышчэпкі» ад эпідэміі акцый і зніжак, часта не адпаведных рэчаіснасці, і падрабязны расказ пра псіхалагічныя прыёмчыкі маркетолагаў. Ці ведалі вы, чаму на ўваходзе ў супермаркет звычайна прадаюць кветкі і садавіну, як матывуюць на лішнія выдаткі ўмела падабраныя гукі, фарбы і водары альбо з якой мэтай рух па гандлёвай зале спраектаваны супраць гадзіннікавай стрэлкі? Усё гэта з дапамогай прафесіяналаў раскладзе па палічках вядучая «Хітрага маркетынгу». Рубрыка выходзіць у праграме па панядзелках — менавіта ў гэты дзень «Беларуская часінка» і спецыялісты з Таварыства абароны правоў спажыўцоў і Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю разбіраюць «спажывецкія» гісторыі гледачоў.

### Мастацтва

## Якая праца больш цэніцца?

### Дзіцячая пляцоўка і «Дзённік у дапамогу дэпутату»: што за цікавыя праекты рэалізуе Магілёўская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў

**Што ўяўляюць сабой асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, «МС» на сваіх старонках ужо неаднаразова расказвала: сёння іх у краіне налічваецца пакуль што тры (у Гродзенскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцях). Фарміраванні маладыя, вопыт толькі напрацоўваюць, але нягледзячы на гэта ўжо ёсць нямала прыкладаў таго, што абраны шлях па стварэнні гэтых інстытуцый правільны. Пра работу Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў па ўстойлівым развіцці тэрыторый, садзейнічанні прадстаўнікам органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ў вырашэнні пытанняў мясцовага значэння расказаў яе старшыня Анатоль МАЦЮЛІН падчас сустрэчы спікера Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча з прадстаўнікамі дэпутацкага корпуса ў Бялыніцкім раёне.**

Нагадаем, што гэтае аб'яднанне народных абраннікаў Магілёўскага рэгіёна існуе чатыры гады. Як і любая арганізацыя, асацыяцыя мае свае мэты і задачы, якія замацаваны ў статуце.

— Першыя гады работы мы планавалі свой удзел з улікам дабрачынных унёскаў дэпутатаў мясцовых Саветаў, а таксама ахвяраванняў прадпрыемстваў, — кажа Анатоль Мацюлін. — Нашай увагай былі ахоплены толькі дабрачынныя акцыі напярэдадні Новага года ў межах рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці».

Ён звярнуў увагу, што ў такіх умовах было складана ўдзельнічаць у вырашэнні праблем, якія існуюць у рэгіёнах. А іх нямала. Пачынаючы ад уладкавання дзіцячых пляцовак, дваравых парковак, рэканструкцыі мемарыяльных комплексаў і грамадзянскіх могілак да будаўніцтва помпавых станцый для водаадвядзення і станцый абезжалезвання.

— Важна разумець, што ўсё гэта неабходна людзям. І наша задача — вызначыць першаступеннасць праблемы акругі, рэгіёна, — кажа ён. — Тут на першы план сярод задач асацыяцыі выходзіць навучанне прадстаўнікоў органаў мясцовага самакіравання. Калі правільна абраная мэта, тады яна падтрымліваецца насельніцтвам як фінансава, так і фізічна. Бо ўласная праца цэніцца больш.

Таму акрамя арганізацыі спаборніцтваў сярод органаў мясцовага самакіравання асацыяцыя шукала сродкі для іх навучання з прыцягненнем міжнародных партнёраў і крыніц. Былі зроблены і самастойныя спробы прыцягнення сродкаў, і з дапамогай латвійскіх калег. Адна з іх прынесла вынік. Асацыяцыя цяпер рэалізуе праект «Эфектыўнае ўзаемадзеянне, сучаснае кіраванне — устойлівы вынік», які фінансуецца варшаўскім пасольствам Каралеўства Нідэрландаў. Дзякуючы гэтаму быў праведзены семінар-нарада для старшынь гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў, старшынь сельсаветаў, а таксама дэпутатаў і прадстаўнікоў органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання на тэму «Заканадаўства ў галіне самакіравання, правы грамадскасці для эфектыўнага ўзаемадзеяння ў вырашэнні мясцовых праблем».

Акрамя таго, шэсць дзён маладыя народныя абраннікі і ўпершыню абраныя дэпутаты з усіх раёнаў Магілёўшчыны навучаліся на семінарах і трэнінгах эфектыўнай камунікацыі для вызначэння патрэб мясцовага грамадства, знаёміліся з асновамі стратэгічнага планавання развіцця тэрыторыі. Вынікам навучання стаў конкурс ініцыятыў сярод дэпутатаў, дзе пяць народных абраннікаў атрымалі рэсурсы для іх рэалізацыі.

***(Заканчэнне на 14-й стар.)***

# Якая праца больш цэніцца?

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 13-й стар. «МС».)*

Цяпер у асацыяцыі распрацоўваюць макет «Дзённіка ў дапамогу дэпутату». Дакумент будзе ўтрымліваць заканадаўчыя нормы ў галіне самакіравання і грамадзянскіх правоў, існуючы вопыт удзелу грамадства ў працэсах прыняцця рашэнняў, станоўчыя прыклады вырашэння мясцовых праблем у Беларусі пры ўдзеле грамадства. Адмысловы раздзел будзе прысвечаны арганізацыі работы з грамадскасцю для стратэгічнага планавання развіцця тэрыторыі.

Таксама Анатоль Мацюлін паведаміў, што заканчваецца работа па стварэнні сайта асацыяцыі.

— Гэта платформа для абмену вопытам і інфармацыяй, — сказаў ён. — Вэб-рэсурс дасць магчымасць атрымаць зваротную сувязь ад дэпутатаў, а таксама дзякуючы яму грамадскасць і недзяржаўныя грамадскія арганізацыі змогуць прапанаваць свае ідэі па вырашэнні мясцовых праблем.

Вяртаючыся да тэмы сродкаў, без якіх немагчымыя ніякія кардынальныя зрухі, трэба сказаць, што сёлета ўпершыню пры падтрымцы фінансавага ўпраўлення аблвыканкама былі вызначаны і сабраны членскія ўзносы ў памеры 123 тысяч рублёў. На што накіравалі гэтыя грошы? Больш за палову сумы пайшло на падтрымку дэпутацкіх ініцыятыў, якія былі разгледжаны і падтрыманы на пасяджэннях сесій і прэзідыумаў абласнога Савета дэпутатаў, гар- і райсаветаў.

> Вынікам навучання стаў конкурс ініцыятыў сярод дэпутатаў, дзе пяць народных абраннікаў атрымалі рэсурсы для іх рэалізацыі.

Што гэта за ініцыятывы? Калі ласка, прыклады. У Чавусах 600 рублёў было накіравана на садзейнічанне жыхарам мікрараёна Ільнозавод у добраўпарадкаванні дзіцячай пляцоўкі, у Краснаполлі — 1275 рублёў на добраўпарадкаванне дзіцячай гульнявой пляцоўкі мікрараёна Машэраўскі, Семукацкаму сельвыканкаму выдзелена 1862 рублі для набыцця дзіцячага спартыўнага абсталявання для пляцоўкі ў парку вёскі Вялікія Бялевічы. Таксама больш за 1200 рублёў было выкарыстана для добраўпарадкавання дзіцячых пляцовак у аграгарадках Мушына, Разанцы і ў вёсцы Пастарнакі. Не застаўся без увагі і абласны цэнтр: 600 рублёў спатрэбіліся для добраўпарадкавання двара па вуліцы Маўчанскага ў межах дамоў 40, 42 і 44.

І гэта далёка не ўсе рэалізаваныя ініцыятывы — іх звыш трыццаці.

— У большасці выпадкаў праекты маюць сацыяльны характар і накіраваны на паляпшэнне месцаў пражывання людзей. Але гэта толькі пачатак, — упэўнены Анатоль Мацюлін. — Мы ўсе вучымся, напярэдадні ў нас глыбокае вывучэнне праблем рэгіёнаў эканамічнага і экалагічнага характару, праўдзенне аналізу з удзелам органаў самакіравання і прапановы па іх вырашэнні ў органы выканаўчай і распарадчай улады Магілёўскай вобласці, актыўныя пошукі фінансаў з іншых законных крыніц.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

## • Неабходны каментарый

**Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Работа, якая праводзіцца Асацыяцыяй у адукацыйнай, інфармацыйнакамунікацыйнай, кансультатыўнай сферах, у цэлым спрыяе павышэнню якасці работы мясцовых Саветаў, умацаванню «зваротнай» сувязі дэпутацкага корпуса і грамадзян, павышэнню ступені даверу насельніцтва да Саветаў і аказання station... 

МЯСЦОВЫ ЧАС

# Рэгіён вялікіх магчымасцяў

## Трохі гісторыі, другі ўраджай гарошку, каштоўная рыба і драўніна для англічан

**Сёння наш аповед пра прэс-тур у Быхаўскі раён, які быў арганізаваны пад эгідай Нацыянальнага прэс-цэнтра «Малая Радзіма — вялікая зямля».**

Афіцыйнай датай заснавання горада Быхава лічыцца 1370 год, хоць, на думку мясцовых гідаў, дата гэтая ўмоўная. Адной з першых пісьмовых крыніц, дзе згадваецца Быхаў, з'яўляецца «спіс гарадоў рускіх далёкіх і блізкіх», напісаны не раней 1380 года.

Ёсць шмат паданняў і легендаў аб паходжанні назвы горада. Найбольш распаўсюджаная з іх апавядае, што на месцы Быхава жыхары хаваліся ад ворагаў — «былі хоў». Ёсць і яшчэ адна гіпотэза, паводле якой сваю назву населены пункт атрымаў ад слова «бухавіца» — так у Сярэднявеччы называлі гарматы. У гэтым горадзе выраблялі і іншую зброю: марціры, шматствольныя ўстаноўкі, напрыклад, «арганы», «шмыгаўніцы». Майстэрня называлася «людвісарня» і была заснавана пры Ходкевічах у другой палове XVI стагоддзя. Прычым ядры выраблялі як з чыгуну, так і з дрэва і нават са шкла. Да 1918 года быхаўскія гарматы яшчэ захоўваліся на тэрыторыі замка. Адну з іх сёння можна ўбачыць у Магілёве.

Быхаўшчына з'яўляецца лідарам па колькасці археалагічных помнікаў у Беларусі — толькі афіцыйна іх налічваецца 157. Гэты факт сведчыць пра тое, што першыя людзі з'явіліся на гэтай зямлі з пачаткам адступлення ледніка, а выяўленыя тут археалагічныя помнікі адносяцца да эпохі каменнага, бронзавага, жалезнага вякоў і эпохі Сярэднявечча.

### Некалькі слоў аб банках

Па словах **старшыні Быхаўскага райвыканкама Дзмітрыя МАРЦІНОВІЧА**, у раёне знаходзіцца 176 населеных пунктаў і дзевяць сельсаветаў, у якіх пражывае каля 29 тысяч чалавек. Штогод раён экспартуе сваёй прадукцыі за мяжу на 13 мільёнаў долараў.

Не так даўно ў райцэнтры ўрачыста адкрылі новы 40-кватэрны жылы дом. Кватэры ў ім атрымалі 195 маючых патрэбу (у тым ліку 184 чалавекі з 34 шматдзетных сем'яў). Але цяпер на жыллёвым уліку стаяць 1,5 тысячы сем'яў, з якіх 100 шматдзетныя. Няшмат? Але для невялікага раёна і не мала. З усімі шматдзетнымі цяпер персанальна працуюць спецыялісты. Такія сем'і атрымліваюць жыллё згодна з 240-м указам, але ёсць адно маленькае «але». Гэта крэдыты мінулых гадоў той ці іншай сям'і. З будаўніцтвам жылля невырашальных задач няма — праблема ў былых не зусім добрых крэдытных гісторыях. Часта ў гэтым вінаватыя і самі атрымальнікі крэдытаў. Разам з тым з сітуацыі трэба неяк выходзіць.



Старшыня Быхаўскага райвыканкама Дзмітрый МАРЦІНОВІЧ.

**Намеснік старшыні райвыканкама Віктар ПУГАЧ** лічыць, што пытанне гэтае не вырашаецца на ўзроўні раённай адміністрацыі. Тут неабходна памяняць прынцыповае стаўленне да крэдытных гісторый у шматдзетных. А гэта ўжо прэрагатыва Нацбанка...

### У далёкую Японію

Падчас займальнай экскурсіі па Быхаўскім агароднінасушыльным заводзе мы на ўласныя вочы ўбачылі, як вырабляецца любімая многімі кабачковая ікра, як пакуюцца кукуруза і зялёны гарошак.

**Кіраўнік прадпрыемства Таццяна КОРАНЬ** расказала, што ААТ «Быхаўскі кансерва-агароднінасушыльны завод» невыпадкова называе сябе «прадпрыемствам вялікіх магчымасцяў». У яго асартыменце — джэм, варэнне, павідла, кетчупы, соусы, таматныя сокі, нектары, салаты, закускі, гарніры — усяго каля 200 найменняў. Тут кансервуюць памідоры, агуркі, морквy, буракі, фасолю. Абавязковае патрабаванне да сыравіны — натуральнасць і экалагічная чысціня. І яшчэ адзін прынцып: упакоўка — толькі шкляная або металічная. За змену выпускаецца 100—120 тысяч адзінак прадукцыі.

На экспарт больш чым у 20 краін — ад Канады да Аўстраліі — адпраўляюць кукурузу і зялёны гарошак, кабачковую ікру і бярозавы сок. Па словах **выканаўчага дырэктара завода Аляксандра МАРОЗАВА,** нядаўна прадукцыяй зацікавілася Японія.

— Аднаго бярозавага соку замовілі восем найменняў. І чыстага, і на травах: з мелісай, чаборам. А яшчэ кукурузу, гарошак, клубнічнае і парэчкавае варэнне, перацёртыя з цукрам журавіны. Праўда, ёсць нюанс: цукру ў прысмакі папрасілі дадаваць менш. Хутка адгрузім ім першую партыю тавару, — распумачыў суразмоўнік. Беларускі зялёны гарошак па параўнанні з кітайскім аказаўся на вышыні — японцы былі ў захапленні, расказвае прадстаўнік прадпрыемства.

Толькі за апошнія тры гады прадпрыемства асвоіла 27 відаў новай прадукцыі. У іх ліку дзіцячыя соусы і сокі. На экспарт сёння ідзе каля 40 % прадукцыі.

А нядаўна ўпершыню ў вобласці на дапаможнай гаспадарцы завода вырасцілі другі ўраджай зялёнага гарошку. Дзякуючы такому ўдаламу эксперыменту ў завода з'явілася дадатковая магчымасць добра зарабіць. Цяпер пачалася ўборка другога ўраджаю — і вынік парадаваў. **Лета расцягнулася яшчэ на два тыдні. І галоўнае, у гэты перыяд гарошак зусім не трэба абараняць ад шкоднікаў. Шкодныя казуркі ўжо закопваюцца ў зямлю перад зімовай сцюжай. Вось і атрымліваецца некрануты прадукт, і абсалютна экалагічна чысты.**

«Пасадзілі суперранішняе венгерскае насенне. Напярэдадні прыступілі да ўборкі ўраджаю, якую плануем завяршыць на працягу двух тыдняў. Занята пад другі ўраджай зялёнага гарошку ў гаспадарцы — 250 гектараў. У пачатку кастрычніка пачнем прыбіраць з палёў кіргізскую фасолю, якую таксама вырасцілі ўпершыню. Цяпер стараемся паспець больш выпусціць запатрабаванай прадукцыі з гарошку. У сувязі з тым, што ў краінах, якія пастаўляюць гэтую культуру, ураджай быў нізкі, цана на яго вырасла. Кошт гатовага прадукту павялічыўся амаль у 1,5 разы. А мы сёлета атрымалі ўласнай сыравіны ў разы больш».

Экспарт прадпрыемства летась склаў у грашовым выражэнні 2,5 мільёна долараў. Значная яго частка ідзе ў Расію. Цікава, што летась Быхаўскі завод, шырока прадстаўлены на расійскім рынку, выпусціў новы від экспартнай прадукцыі — узвары. Эксперымент аказаўся паспяховы, асабліва попытам вішнёвыя ўзвары карысталіся на поўначы Расіі, і сёлета пастаўкі гэтай прадукцыі павялічыліся.

### Англічан «парадуем» слупамі

Быхаўскі лясгас летась у снежні адкрыў цэх па вытворчасці акоранай і ацыліндраванай драўніны і амаль 100 % сваёй прадукцыі пастаўляе на знешні рынак. Як адзначыў



дырэктар лясгаса дэпутат Быхаўскага раённага Савета Віктар КУЗНЯЦОЎ *(на фота)*, у асноўным прадукцыя ідзе праз пасярэднікаў на англійскі рынак. Там з беларускіх калоў і слупоў робяць платы, агароджваюць выпасы для авечак і зямельныя ўчасткі.

«Мы пачалі інтэнсіўна займацца перапрацоўкай менавіта дробнатаварнай і нізкагатунковай драўніны. Аказалася, гэта вельмі добрая ніша. На ўчастку былога аэрадрома пабудавалі цэх, на гэта пайшоў год. Закупілі абсталяванне ў растэрміноўку. Працуем у трохзменным рэжыме. Ёсць яшчэ цэх лесапілавання, — расказвае дэпутат. — Простыя вычышчаныя калы прадаём як пазалочаныя калодачкі — па 130 еўра за кубічны метр». Паводле яго слоў, асноўныя краіны — спажыўцы прадукцыі — Германія, Бельгія і Прыбалтыка.

Шэраг фірмаў сталі пастаяннымі партнёрамі лясгаса. Ім зручна, што тут у любы час можна загрузіцца і аформіць дакументы — на месцы ёсць зона мытнага афармлення. У жніўні, напрыклад, адсюль пайшло 1024 кубаметры прадукцыі — гэта 40 машынагрузаў.

Кажучы пра аб'ёмы вытворчасці, Віктар Кузняцоў адзначыў, што ў грашовым выражэнні месячны экспарт дасягае ў сярэднім 120 тысяч долараў. Сярэдні заробак работнікаў цэха складае 1130 рублёў.

### Зімой і летам плюс 12 градусаў

На фарэлевай гаспадарцы «Лохва» з канца 2013 года рэалізуецца інавацыйны праект па гадоўлі рыб каштоўных парод. За гэтыя гады прадпрыемства стала найбуйнейшым у сферы таварнага вырошчвання стронгі, нарасціла аб'ёмы вытворчасці жывой рыбы са 110 тон да 550 тон за год.

У акцыянернага таварыства ёсць філіялы ў Бялыніцкім, Касцюковіцкім раёнах і ў Горках. Летась усталявалі новае абсталяванне па ўпакоўцы астуджанай рыбы, таксама адкрылі новы ўчастак па вытворчасці ікры вясёлкавай фарэлі.

«Пастаўка рыбы ажыццяўляецца ў Беларусі галоўным чынам у вялікія фарматныя крамы. Экспарт у асноўным ідзе ў Расію, пераважна астуджанай рыбы», — расказвае **галоўны інжынер Дзмітрый ЛУКАШЭВІЧ.** Па яго словах, каб вырасціць рыбу да прадажнага выгляду — вагой каля 800 грамаў — трэба не менш за восем месяцаў.

Адзінае адрозненне тутэйшай стронгі ад нарвежскай — тое, што жыве яна не ў марской, а ў прэснай вадзе, здабытай з артэзіянскай свідравіны. У штучных вадаёмах цэлы год падтрымліваецца стабільная тэмпература — плюс 12 градусаў. Летась на экспарце «Лохва» зарабіла больш за мільён долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ГОРАД СА СМАКАМ КАВЫ

## У Гродне амаль кожны тыдзень адкрываюцца бары і кафейні, але іх не хапае



**Бязвіз і Дэкрэт № 7 аб развіцці прадпрымальніцтва далі прыкметны штуршок для развіцця сферы абслугоўвання. У Гродне за два з паловай гады адкрыта больш за 40 аб'ектаў грамадскага харчавання агульнай умяшчальнасцю 1300 месцаў. Найбольш папулярнымі робяцца бары і кавярні новага фармату.**

Змяненні ў першую чаргу заўважаюць самі гродзенцы. Людміла і Генадзь, якія шпацыравалі па гарадскіх вуліцах, адзначылі, што па колькасці і якасці харчовага сэрвісу Гродна набліжаецца да еўрапейскіх гарадоў. У новы імідж, на іх думку, уносіць уклад лаўнж-кафэ на даху гандлёвага цэнтра.

— Гэта сапраўды нешта новае, што асвяжае стыль горада, да таго ж дахі зверху прыгожа глядзяцца, яны сталі акуратныя, вельмі захапляе панарама, — выказала сваю думку Людміла.

Панарамная кавярня на даху працуе другі год. Гэта сезонны аб'ект з лёгкім меню, але, магчыма, будзе працаваць і на працягу года, паведаміла прадстаўнік адміністрацыі ўстановы Вольга Уладзіміраўна. На яе думку, наведвальнікаў вабіць менавіта новы фармат. Сюды з задавальненнем прыходзяць не толькі гродзенцы, але і шматлікія турысты. Ідэя яго стварэння ўзята ў суседзяў-літоўцаў.

Кавярня гатова прыняць і замежных турыстаў — супрацоўнікі ведаюць замежныя мовы, адпаведна распрацавана і меню. Дызайн даволі арыгінальны: вы нібыта знаходзіцеся ў дэндрарыі, тут ёсць і маньчжурскі арэх, і буякі, і нават клубніцы. І хоць у меню шмат страў з гэтымі ягадамі, яны растуць тут у якасці дэкарацыі.

Хутка новая кавярня з'явіцца каля чыгуначнага вакзала, паведамілі ва ўпраўленні гандлю гарвыканкама. Адкрыць яе планye прадпрымальнік з Гродзенскага раёна. Гараджане добра ведаюць яго тарты, якія выпякаюцца ў кандытарскім цэху аграгарадка Парэчча. Бізнесмен мяркуе пашырыць сваю вытворчасць і адкрыць цэх у Гродне, а разам з ім яшчэ і кавярню. Для аб'екта харчавання выдзелены ўчастак у цэнтры горада, недалёка ад гіпермаркета. Раней тут знаходзілася чэбурэчная, але згодна з генпланам яе знеслі два гады таму для пашырэння дарогі. А непадалёк павілён з'явіцца даволі цікавы на выгляд двухузроўневы аб'ект, у якім шмат шкла і крыху бетону.



Увогуле, аб'екты харчавання робяцца папулярнымі ў інвестараў. Амаль кожны тыдзень на карце горада з'яўляецца новая ўстанова. З пачатку года іх адкрыта больш за дзясятак, а ўсяго ў абласным цэнтры — амаль 460. Яны разлічаны на 27 тысяч месцаў.

— На момант прыняцця бязвізавага рэжыму далёка не ўсе ўстановы былі гатовы прыняць іншаземных турыстаў. Не было меню на замежных мовах, не валодаў імі і персанал, былі праблемы з сістэмай інтэрнэту Wi-Fi, — кажа **начальнік упраўлення гандлю і паслуг Гродзенскага гарвыканкама Алена ГРЭБЕНЬ.** — На сённяшні дзень сітуацыя значна змянілася. Аб'екты харчавання праходзяць з турфірмамі і арганізуюць харчаванне па запыце, у тым ліку з музычным суправаджэннем.

Нядаўна стан гандлю і грамадскага харчавання быў разгледжаны на сесіі гарсавета. Дэпутаты праехаліся па некаторых аб'ектах, каб бліжэй пазнаёміцца з магчымасцямі і праблемамі харчовых пунктаў. У першую чаргу яны наведалі рэстаран, дзе прапануюць толькі беларускую кухню. Ён не так даўно з'явіўся ў самым цэнтры старога горада, у гістарычным будынку. Але такіх пунктаў з прапановамі страў нацыянальнай кухні ў горадзе недастаткова, лічыць Надзея Грэбень.

Падчас выязной сесіі прагучала думка, што паграгранічны Гродна адстае ад таго ж Брэста па насычанасці такімі аб'ектамі, прытым што нарматыў выконваецца. У горадзе 42 пасадачныя месцы на тысячу чалавек пры норме 40 месцаў. Але гэтыя нормы, відавочна, будуць пераглядацца. Што датычыцца абласнога цэнтра, то сфера харчавання будзе развівацца за кошт будаўніцтва новых і рэканструкцыі старых будынкаў. Магчыма, у хуткім часе ў Гродне з'явіцца і першы ў горадзе рэстаран хуткага харчавання «Макдональдс». Для яго будаўніцтва ўжо выдзелены зямельны ўчастак, паведамілі ў гарвыканкаме.

**Старшыня Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў Барыс ФЁДАРАЎ:**

— У найбліжэйшы час чакаецца адкрыццё яшчэ некалькіх аб'ектаў харчавання, актыўна развіваецца работа нестацыянарных устаноў, у тым ліку фудтракаў. Яшчэ зусім нядаўна іх наогул не было ў горадзе, а цяпер на аўкцыёнах за месцы ў цэнтры вядзецца сапраўдная барацьба. Гэта сведчыць пра тое, што паток турыстаў расце і ў горадзе ёсць каму іх прыняць і накарміць.

Як стала вядома, не ўсе аб'екты харчавання працуюць па правілах. Некаторым гродзенскім барам літаральна днямі на планёрцы ў гарвыканкаме вынесена папярэджанне, перадае тэлеканал «Гродна плюс». Часова абмежаваны рэжым работы бару «Мята» на вуліцы Маставой. Ён будзе працаваць да першай гадзіны ночы, пакуль не будуць выпраўлены заўвагі. Узята на кантроль работа бара Cuba з-за парушэння графіку работы. Дадзены час для выпраўлення заўваг бару «Рэактар». Усе пералічаныя бары знаходзяцца ў цэнтры горада.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**



**23 октября 2019 г.** **ИЗВЕЩЕНИЕ** **№ 14-А/2019**

**о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды, лет | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку докум-ции, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Ул. Богдана Хмельницкого (остановка общественного транспорта «ул. Бакунина», нечетная сторона) | 340100000006005811 | 0,0031 | Для строительства (установки) и обслуживания легкотипного торгового павильона и (или) павильона бытового обслуживания населения | Ограничений в использовании не имеет | 5 | 417,32 | 20,00 | 2 496,36 |
| 2 | По ул. Нижнебрилевской (поз. № 1) | 340100000004001408 | 0,0160 | | Охранная зона линий связи и радиофикации, водоохранная зона рек и водоемов | 5 | 1 330,63 | 50,00 | 2 390,40 |
| 3 | По ул. Могилевской в районе строительного магазина «ОМА» | 340100000003003379 | 1,4077 | Для строительства торгово-развлекательного комплекса или объектов гостиничного назначения, или здания специализированного культурно-просветительского и зрелищного назначения, или здания специализированного общественного питания, или здания специализированного финансового назначения, или здания специализированного розничной торговли, или здания специализированного бытового обслуживания населения | Охранная зона электрических сетей, сетей и сооружений канализации, водоохранная зона рек и водоемов, сетей и сооружений теплоснабжения | 5 | 123 677,28 | 6 200,00 | 2 449,90 |
| 4 | В микрорайоне 59Б | 340100000006005680 | 2,6500 | Для строительства многофункционального комплекса (магазин продовольственных товаров, магазин промышленных товаров, баня, парикмахерская, мастерские бытового обслуживания населения) | Охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения, электрических сетей, объектов газораспределительной системы, зона санитарной охраны водопроводных сооружений | 5 | 229 056,20 | 11 500,00 | 5 844,03 |

1. Организатор аукциона — Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее — Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3—6, № 3—14).
3. **Аукцион состоится 23 октября 2019 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, а также иностранные юридические лица, иностранные граждане, консолидированные участники, которые в указанные в извещении сроки внесли задаток для участия в аукционе на следующий счет: **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа — Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа — оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того, НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (транзитный счет) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 — для возврата задатка за участие в аукционе (в случае «непобеды» на аукционных торгах) — это только для физических лиц.** Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.

Перечень документов предоставляемых участником:
4.1 заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; гражданам РБ — копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность.
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь — доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели — копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, и его копию.
5. По желанию «потенциального покупателя» Организатор аукциона осуществляет показ земельного участка на местности.
6 Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности в процессе подготовки и проведения аукциона.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
7. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
8. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 20 сентября по 21 октября 2019 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед — 12.00—13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14.**

**Контактный телефон +375 232 30 12 46. Информация размещена на сайте: www.geodezcentr.by либо gomeloblzem.by**

# СМАЧНА І КАРЫСНА

## Плошчы пладова-ягадных насаджэнняў у Брэсцкай вобласці плануюць абнавіць і пашырыць


Фота БелТА

**Адпаведны комплекс мерапрыемстваў распрацаваны Брэсцкім абласным выканаўчым камітэтам і ўзгоднены з Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання.**

Пра неабходнасць абнаўлення, пераспецыялізацыі і пашырэння пладова-ягадных насаджэнняў у рэгіёне ішла гаворка падчас рабочай паездкі кіраўніка дзяржавы ў Баранавіцкі раён сёлета 22 сакавіка. Гэтае пытанне трымае на кантролі старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Брэсцкай вобласці Міхаіл Мясніковіч.

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента, інвентарызацыя пладова-ягадных насаджэнняў, праведзеная мясцовымі ўладамі, паказала, што ў вобласці налічваецца 6,5 тысячы гектараў шматгадовых насаджэнняў, у тым ліку семечкавых — 4,4 тысячы, костачкавых — 0,1 тысячы, ягадных — 2 тысячы гектараў. План прадугледжвае эфектыўнае выкарыстанне гэтых плошчаў з улікам глебава-кліматычных асаблівасцяў рэгіёна і агратэхнічных умоў.

# НАЙСТАРЭЙШЫЯ БРЭСЦКІЯ КНІГІ

## Факсімільнае выданне Брэсцкай Бібліі і электронная копія кнігі Брэсцкага магістрата перададзены бібліятэкам горада

**Падарункі да юбілею Брэста не скончыліся на святкаванні. Як вядома, адным з самых значных і знакавых з іх стаў арыгінал Брэсцкай Бібліі, якую перадаў у дар брастаўчанам Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. А на выязным пасяджэнні Бібліятэчнай Асамблеі Еўразіі, якую Брэст прыняў у якасці культурнай сталіцы СНД на мінулым тыдні, адбылася ўрачыстая перадача факсімільнага выдання Брэсцкай Бібліі і электроннай копіі кнігі Брэсцкага магістрата 1623—1626 гадоў.**

Арыгінал Бібліі — вельмі каштоўны экспанат, ён патрабуе скрупулёзнай даследчай работы. Зразумела, убачыць яго наведвальнікам музея горада пакуль што нельга. А вось паглядзець альбо нават дакрануцца да сучаснай копіі каштоўнай кнігі цяпер можна: кампанія «Белнафтастрах» прафінансавала выданне, якое ажыццявіла Нацыянальная бібліятэка. Цяпер 10 з 11 факсіміле будуць захоўвацца ў Брэсце. Падарунак уручыў генеральны дырэктар кампаніі Анатоль Чайчыц.

Ініцыятарамі другога кніжнага праекта выступілі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Вольга Папко, Леанід Брыч, Анатоль Дашко, Валянцін Мілашэўскі пры падтрымцы Галоўнага ўпраўлення Нацыянальнага банка Беларусі па Брэсцкай вобласці. Была зроблена электронная копія кнігі Брэсцкага магістрата за 1623—1626 гады. Гэта выданне старэйшае за Брэсцкую Біблію. Цяпер яно ў электронным выглядзе знаходзіцца ў арсенале мясцовых бібліятэк.

# ХРЭСНЫ ХОД У ГОНАР СВЯТОГА

**У Брэсце прайшлі ўрачыстыя набажэнствы і хрэсны ход у гонар прападобнапакутніка Афанасія, ігумена Брэсцкага. Праваслаўная царква шануе памяць гэтага святога, які прыняў пакутніцкую смерць за праваслаўную веру.**

Афанасій Брэсцкі, у міру вядомы як Афанасій Філіповіч, — пісьменнік, грамадска-рэлігійны дзеяч, публіцыст, кампазітар, аўтар знакамітага «Дыярыуша», ігумен брэсцкага манастыра. 18 верасня 1648 года ён быў катаваны і застрэлены салдатамі брэсцкага ваяводы за тое, што не прыняў Брэсцкую унію 1596 года. Праз некалькі гадоў пасля смерці Афанасія Філіповіча прызналі святым.

У 2006 годзе ў Брэсце каля Свята-Сімяонаўскага сабора адкрылі помнік «нябеснаму заступніку» Афанасію Брэсцкаму. Кожны год у дзень яго смерці ў горадзе праходзяць памятныя мерапрыемствы.

Гэтым разам да нас прыехалі архірэі з Польшчы, Расіі, Украіны, іншых епархій Беларусі. Ранкам ад кафедральнага сабора вернікі прайшлі хрэсным ходам да Афанасьеўскага мужчынскага манастыра, дзе адслужылі Боскую літургію з малебнам. Пазней архіпастыры ўсклалі кветкі да помніка прападобнапакутніка Афанасія, ігумена Брэсцкага.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: ОАО «Трест Белстромремонт» (УНП 100135597) в лице ликвидатора ООО «Партнер-Консультант» +375 17 392-70-60, +37529 304-59-90.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **21 октября 2019 г. 09.00—17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль «Шкода Октавия» (рег. знак 1059 АН-3) 2007 г. в. | 5520,00 |
| 2 | Шасси погрузочное многофункциональное «Амкодор 352» (рег. знак КА-7 7056), 2007 г. в. | 39 480,00 |
| 3 | Грузовой самосвал МАЗ 5516 А5-380 (рег. знак АЕ 8652-7), 2008 г. в. | 24 120,00 |

Местонахождение — г. Гродно, ул. Дубко, 11, тел. для ознакомления +37529 589-41-34.

**Для участия в торгах необходимо** в срок по 18.10.2019 г. 17.00 1) 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель — ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов — 5 %, задаток — 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи.

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: Частное строительное унитарное предприятие «ГостСтрой» (УНП 590778694), 223034, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Советская, д. 118, ком. 1/4, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридический момент», тел. +375 (29) 616-50-57.

Повторные публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее — торги) будут проведены: **7 октября 2019г**. 09.00—17.00 на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение инв. №124/С-21348, здание административно-хозяйственное – административное здание, площадь 450,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, г. п. Пружаны, ул. Лазо, 22 | 51 864,71 |
| 2 | Капитальное строение, инв. №124/С-21346, здание пристройки к заводоуправлению, площадь 298,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, г. п. Пружаны, ул. Лазо, 22 | 34 326,64 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 04.10.2019 г. 17.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовало в газете «Республика» от 22.06.2019 г.

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

03.10.2019 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 133, офис № 1 состоится внеочередное Общее собрание акционеров ОАО «Белбуд». Форма проведения — очная.

***Повестка дня:***

О выплате дивидендов по результатам 2016 года.

УНП 100794022

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства объекта (ул. Гаражная) в городе Гродно 8 октября 2019 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации, руб. | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1*. | Право аренды земельного участка У-2 сроком на 25 лет | ул. Гаражная | 0,3956 | 440100000001010086 | 34 638,24 | 3 465,00 | 4 375,0 | Строительство объекта производственного назначения, возможно, станция технического обслуживания |

- земельный участок имеет ограничения.

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года — гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале №400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 8 октября 2019 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 23 сентября по 2 октября 2019 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-00-10**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**

220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 19 верасня 2019 года.**